ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 89 (4341)
СЕРАДА, 20 красавіка 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ПЕРАДАВІКОМ-УДАРНІКАМ ЯКАСЬЦІ—ДЭЛЕГАТАМ УСЕБЕЛАРУСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ!

IX усесаюзны зьезд прафсаюзаў

Сёньня адкрываецца IX усесаюзны зьезд прафсаюзаў.

Гэты зьезд зьявіцца важнейшай датай у гісторыі прафесыянальнага руху Савецкага Саюзу. Зьезд заклікан падсумаваць багаты вопыт барацьбы прафсаюзаў за будаўніцтва сацыялізму ва ўмовах рэканструкцыйнага пэрыяду, вызначыць далейшы маршрут па аснове дырэктыў XVII партканфэрэнцыі аб другой пяцігодцы.

Прафесыянальным саюзам належыць адказнае месца ў палітычным і гаспадарчым жыцьці краіны. Гэта — сапраўдная школа камунізму, моцны вагар пераробкі мас у сьвядомых удзельнікаў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Тав. Сталін, аналізуючы будову дыктатуры пралетарыяту, акрэсьлівае значэньне масавых арганізацый рабочай клясы, «без дапамогі якіх немагчыма ажыцьцяўленьне дыктатуры», перш за ўсё паказвае на «прафсаюзы рабочых з іх разгалінаваньнямі ў цэнтры і на мясцох у выглядзе цэлага раду вытворчых, культурных, выхаваўчых і іншых арганізацый». І далей тав. Сталін указвае: **«Прафсаюзы можна назваць пагалоўнай арганізацыяй пануючай у нас рабочай клясы. Яны зьяўляюцца школай камунізму. Яны вылучаюць са свайго асяродзішча лепшых людзей для кіруючай работы па ўсіх галінах кіраўніцтва. Яны ажыцьцяўляюць сувязь паміж перадавымі і адсталымі ў складзе рабочай клясы. Яны злучаюць рабочыя масы з авангардам рабочай клясы».**

Такавы адказная роля і задачы прафсаюзаў у эпоху дыктатуры пралетарыяту. Адсюль і тая вялізарная ўвага, якую партыя заўсёды аддавала і аддае прафесыянальнаму руху, тая рашучасьць, з якой партыя змагаецца супроць усялякіх скажэньняў [illegible] ціцыцаў у прафесыянальным будаўніцтве.

Работа прафсаюзаў паміж VIII і IX зьездамі вызначалася пэрыядам разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, задачамі ажыцьцяўленьня лёзунгу мільёнаў: «Пяцігодка — за чатыры гады».

Рэканструкцыйны пэрыяд патрабаваў ад прафсаюзаў, як самай шырокай арганізацыі рабочае клясы, рашучай перабудовы работы, больш актыўнага ўдзелу на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Ажыцьцяўленьне гэтых задач праводзілася прафсаюзамі, пад кіраўніцтвам партыі, у жорсткай барацьбе з апартунізмам, элемэнтамі трэд'юніянізму і аналітычнасьці.

Апартуністычная кіруючая група старога складу УсеЦСПС, якая ўваходзіла ў тагачасную правую апазыцыю, адлюстроўваючы супраціўленьні капіталістычных элемэнтаў разгорнутаму наступленьню сацыялізму, тармазіла перабудову прафсаюзаў, заняла па ўсіх важнейшых пытаньнях прафруху антыленінскую лінію.

Старое кіраўніцтва УсеЦСПС узяло курс на аслабленьне партыйнага кіраўніцтва прафсаюзамі, на адрыў прафсаюзаў ад партыі. Выказваючы трэд'юніянісцкія тэндэнцыі, старое кіраўніцтва процідзеяла актыўны ўдзел прафсаюзаў у сацыялістычным будаўніцтве задачам паляпшэньня матар'яльнага становішча рабочых мас. Прытрымліваючыся апаратна-бюракратычных мэтадаў работы, былое кіраўніцтва УсеЦСПС адмаўляла асноўны вагар барацьбы за баявы тэмпы пашага разьвіцьця — сацспаборніцтва і ўдарніцтва, супраціўлялася разгортаньню бальшавіцкай самакрытыкі.

Прафсаюзы, пад кіраўніцтвам партыі, аслабаніліся ад правадыроў, што капітулявалі перад цяжкасьцямі рэканструкцыйнага пэрыяду, павялі жорсткую барацьбу з іх спадчынай у прафруху.

На аснове генэральнай лініі партыі прафсаюзы дабіліся вялікіх посьпехаў у перабудове і паляпшэньні сваёй работы, павысілі свой удзел у сацыялістычным будаўніцтве.

Разбуйненьне прафсаюзаў паблізіла цэнтральныя органы да нізавых зьвеньняў, забясьпечыла паляпшэньне якасьці штодзеннага кіраўніцтва. Прафсаюзны апарат, ачышчаючыся ад апартуністычных элемэнтаў, папоўніўся ўдарнікамі вытворчасьці.

Рост аўтарытэту прафсаюзаў у вачох працоўных пацьвярджаецца плённым павялічэньнем саюзнай масы. Колькасьць членаў прафсаюзаў вырасла на 1 студзеня 1932 г. да 16.504 тыс. чалавек супроць 10.994 тыс. у 1928 г.

Ажыцьцяўленьне асноўнай задачы, пастаўленай перад прафсаюзамі XVI зьездам УсеКП(б) — паварот тварам да вытворчасьці, — адбываецца на аснове магутнага ўздыму сацспаборніцтва і ўдарніцтва, разьвіцьця іх вышэйшых форм — сустрэчных прамфінпляноў, «сквозных» брыгад, грамадзкіх буксіраў, зьменна-сустрэчных пляноў і, нарэшце, брыгаднага гаспадарчага разрахунку. 4 мільёны ўдарнікаў, 155 тыс. гаспадарча-разрахунковых брыгад — яркі паказальнік творчай энэргіі рабочай клясы. **Ударнік стаў цэнтральнай фігурай прафруху.**

Перамагаючы супраціўленьне апартуністычных элемэнтаў у сваіх радох, якія недаацэньваюць саўгаспа-калгаснага будаўніцтва, прафсаюзы зьявіліся актыўнымі ўдзельнікамі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Прафсаюзы выкрылі і адкінулі «палітыку» старога кіраўніцтва УсеЦСПС, якая процідзеяла цэхавым інтарэсы пасобных груп агульна-клясавым інтарэсам пралетарыяту і адрывала за дачы паляпшэньня дабрабыту рабочай клясы ад барацьбы за прамфінплян. Такая «абарончая» работа старога кіраўніцтва УсеЦСПС азначала па сутнасьці справы адмаўленьне ад сапраўднага ўздыму матар'яльнага становішча рабочых мас, бо толькі на аснове ўмацаваньня сацыялістычнай эканомікі, на аснове росту прадукцыйнасьці працы можна дабіцца рэальных вынікаў па паляпшэньні матар'яльна - бытавых умоў рабочай клясы.

Пэрыяд паміж зьездамі характарызуецца няўхільным павышэньнем жыцьцёвага ўзроўню працоўных мас, сыстэматычным паляпшэньнем, па аснове посьпехаў пяцігодкі, іх матар'яльна-культурнага становішча. **Фактарам вялізарнай важнасьці зьяўляецца ліквідацыя ў Савецкім Саюзе беспрацоўя.** Сярэднягадавая зарплата па ўсёй народнай гаспадарцы ўзрасла з 702 руб. у 1928 г. да 1.101 руб. у 1931 г. У бягучым годзе ўстаноўлен далейшы рост на 71,2 проц. Буйнейшыя асьнаваньні зроблены па лініі камунальнага будаўніцтва і культурна-бытавых устаноў. З 1928 па 1931 г. жыллошчай забясьпечана каля 3 млн. чал. Звыш 3 млн. чал. будуць задаволены жыллошчай у бягучым годзе. Вырас бюджэт па сацыяльным страхаваньні. Паляпшылася мэдычнае абслугоўваньне рабочых, рамонт іх здароўя. Праз дамы адпачынку, санаторыі і курорты ў 1931 г. прапушчана 1.600 тыс. чал., супроць 540 тыс. у 1928 г. У бягучым сэзоне намечана прапусьціць 2.300 тыс. чал.

Прафсаюзы актыўна змагаюцца за паляпшэньне рабочага спажэньня, за разьвіцьцё прыгарадных гаспадарак, за павышэньне якасьці грамадзкага харчаваньня.

Бясспрэчны дасягненьні ў культурна-палітычнай рабоце прафсаюзаў.

Вось асноўныя вынікі, з якімі прыходзяць прафсаюзы да свайго IX зьезду.

Гаворачы аб вялізарных посьпехах прафруху, «неабходна рашуча падкрэсьліць паяўшасьць яшчэ буйных недахопаў, якія выкрыліся ў рабоце прафсаюзаў за справаздачны пэрыяд. Яшчэ да канца не пераможаны праваапартуністычныя і «лявацкія» скажэньні ў рабоце пасобных прафарганізацый... Надзвычайная маруднасьць тэмпаў работы яшчэ многіх прафарганізацый, адсутнасьць належнай увагі да кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, слабая барацьба з ураўнілаўкай і далёка яшчэ невыстарчальная работа прафсаюзаў па абслугоўваньні непасрэдных патрэб аб'яднаных імі мас» (са справаздачы УсеЦСПС).

Рад прафарганізацый, у тым ліку і беларуская, яшчэ рэзка адстаюць у ажыцьцяўленьні **6 умоў тав. Сталіна.**

IX зьезд паслужыць пераломным момантам у зжываньні ўсіх гэтых недахопаў, у разгортваньні баявых тэмпаў правядзеньня ў жыцьцё 6 умоў перамогі.

Уладзімер Ільліч Ленін падкрэсьліваў, што **«будучы школай камунізму наогул, прафсаюзы павінны быць, у прыватнасьці, школаю кіраўніцтва сацыялістычнай прамысловасьцю, а затым паступова і зямляробствам, для ўсіх рабочых, а потым і для ўсіх працоўных».** Гэта ўказаньне Леніна абавязвае прафсаюзы яшчэ бліжэй падыйсьці да ажыцьцяўленьня лёзунгу «тварам да вытворчасьці», яшчэ больш павысіць сваю ролю ў сацыялістычным будаўніцтве.

Савецкі Саюз знаходзіцца па грані другой пяцігодкі. Пабудова бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва будзе праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, барацьбы з правым і «левым» апартунізмам, у асаблівасьці з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай. Гэта высоўвае задачу ўсямернага ўзмацненьня дыктатуры пралетарыяту, умацаваньня ўсіх арганізацый рабочай клясы, у тым ліку прафсаюзаў.

Прафсаюзы павінны яшчэ больш узьняць сваю пільнасьць да прошукаў ворагаў дыктатуры пралетарыяту, узмацніць барацьбу з апартунізмам, паглыбіць палітычнае выхаваньне мас на аснове растлумачэньня агульна-клясавых інтарэсаў пралетарыяту, змагацца з дробна-буржуазнай расхлябанасьцю, рвацтвам, перажыткамі цэхаўшчыны, дробна-ўласьніцкіх настрояў, разгортваць яшчэ шырэй ударніцтва, узмацняць працоўную дысцыпліну на вытворчасьці.

Самая рашучая барацьба павінна весьціся з апартунізмам у прафруху, з трэд'юніянізмам, з анархасацыялізмам, а таксама з рэшткамі контрраволюцыйнага трацкізму.

Посьпехі прафсаюзаў за час паміж VIII і IX зьездамі гавораць аб буйнейшай перамозе генэральнай лініі партыі ў прафруху. Вучэньне Леніна і Сталіна аб ролі і задачах прафсаюзаў у эпоху дыктатуры пралетарыяту яшчэ раз цалкам пацьвердзілася на вопыце работы прафсаюзаў у рэканструкцыйны пэрыяд.

На аснове вучэньня Леніна і Сталіна прафсаюзы і надалей будуць выконваць сваю ролю школы камунізму, будуць актыўнымі памочнікамі партыі ў пабудове бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ПА ЯКАСЬЦІ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

Харчовая прамысловасьць адыгрывае вялізарную ролю ў выкананьні народна-гаспадарчых плянаў. Магутныя тэмпы індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі непарыўна зьвязаны з арганізацыяй харчовага спажэньня шырокіх працоўных мас.

XVII усесаюзная партканфэрэнцыя ў сваёй рэзалюцыі па дакладзе тав. Арджанікідзэ падкрэсьліла, што аднэй з важнейшых задач прамысловага пляну 1932 году зьяўляецца больш узмоцнены рост харчовай прамысловасьці, мабілізацыя сырцовых рэсурсаў і іх рацыянальнае скарыстаньне.

Харчовая прамысловасьць БССР пад кіраўніцтвам партыі за апошнія гады дабілася вялікіх посьпехаў на шляху ператварэньня саматужнай вытворчасьці, раскіданай па розных арганізацыях, у буйную мэханізаваную індустрыю. Даволі адзначыць, што за апошнія тры гады ў рэканструкцыю харчовай прамысловасьці ўкладзена каля 30 млн. руб. Выпуск прадукцыі ў 1931 г. узрос больш, як на 6 раз у параўнаньні з 1928-29 годам. Выкапана за тры гады пяцігодка кандытэрска-макаронная вытворчасьці. Выпуск прадукцыі ў 1932 годзе павялічваецца супроць мінулага году на 64 проц. У новае будаўніцтва павінна быць укладзена каля 20 млн. руб. Рост вытворчасьці разгортваецца па лініі найважнейшых прадуктаў рабочага спажэньня.

На аснове пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР у Магілеве будуецца буйны, абсталяваны паводле апошняга слова тэхнікі, мясакамбінат; у Гомелі ў хуткім часе ўвойдзе ў строй буйны маргарынавы завод. Разгортваецца кансэрвовая вытворчасьць.

Аднак, разгортваньне вытворчасьці і якасьць работы харчовай прамысловасьці яшчэ адстаюць ад росту запатрабаваньняў шырокіх працоўных мас. Нездавальняючая якасьць пасобных відаў харчовай прадукцыі самым адмоўным чынам адбіваецца па рэальнай зарплаце рабочых і на росьце прадукцыйнасьці працы. Ня гледзячы на некаторы пералом, дасягнуты на аснове разгортваньня вышэйшых форм сацспаборніцтва, на базе ажыцьцяўленьня пасьці ўмоў тав. Сталіна, якасьць прадукцыі яшчэ не стаіць на належнай вышыні. Ухіленьне ад стандарту печанага хлеба ў лютым складала 38,2 проц. У студзені выпушчана нестандартных круп 24 проц. Санітарнае становішча мясакамбінатаў не забясьпечвае вырабу высокаякасных мясапрадуктаў.

Партыйныя і прафесыянальныя арганізацыі многіх прадпрыемстваў харчовай прамысловасьці яшчэ не паставілі ажыцьцяўленьне якасных паказальнікаў у цэнтры сваёй увагі. Апла та працы на большасьці заводаў ня ўвязана з барацьбой за паляпшэньне якасьці прадукцыі. Заводзкія лябараторыі і інспэкцыя па якасьці не наладзілі дакладнага кантролю за выхадам прадукцыі, і абмяжоўваюцца часта голай рэгістрацыяй фактаў вырабу браку. Не наладжана яшчэ транспартаваньне харчовых вырабаў, што адмоўна адбіваецца па іх якасьці. Склад бракераў на радзе заводаў не ўкамплектован кваліфікаванымі работнікамі. У сьвятле гэтых прычын асаблівая яснай становішча ўся мізэрнасьць апартуністычных рэзважаньняў пасобных гаспадарнікаў, быццам «дрэнны сырэц— асноўная прычына нізкай якасьці».

Выявіць усе тормазы на шляху паляпшэньня якасьці прадукцыі, намеціць канкрэтныя меры па іх зьнішчэньні, мабілізаваць масы рабочых харчавікоў па барацьбу за якасьць, уцягнуць у гэту справу работнікаў прылаўку — задачы ўсебеларускай канфэрэнцыі па якасьці харчовай прамысловасьці, якая сёньня адкрываецца.

Кастрычніцкі пленум ЦК УсеКП(б), надаючы выключнае значэньне якасьці прадуктаў шырокага спажываньня, абавязаў усе арганізацыі паставіць работу па паляпшэньні якасьці, як адну са сваіх важнейшых задач. XVII усесаюзная партканфэрэнцыя востра паставіла пытаньне аб паляпшэньні якасьці.

Дырэктывы партыі павінны легчы ў аснову работы канфэрэнцыі. Яна павінна стаць пераломным этапам на шляху ўсямернага паляпшэньня якасьці работы харчовай прамысловасьці.

17-ты дзень генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы

СЯЎБУ Ў ЕЛЬШЧЫНЕ І ХОЙНІКАХ ТАРМОЗІЦЬ

няправільная арганізацыя вытворчых брыгад і адсутнасьць выразнага апэрацыйнага кіраўніцтва,

ПРЫЦЯГВАЮЧЫ ДА ЎДЗЕЛУ Ў ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРЦЫ ПАДРЫХТАВАНАСЬЦІ ДА ВЯСНЫ САМЫЯ ШЫРОКІЯ МАСЫ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ, ДАБІЦЦА НЕАДКЛАДНАЙ ЛІКВІДАЦЫІ НЕДАХОПАЎ, ВЫЯЎЛЕНЫХ У ПАЧАТКУ СЯЎБЫ

УРОКІ ПЕРШЫХ ДЗЁН СЯЎБЫ

ХОЙНІКІ. Калгасы **Вялікаборскага, Амальскага, Маханавіцкага, Хобенскага** і раду іншых сельсаветаў ужо **шырока разгарнулі палявыя работы. Поўную падрыхтаванасьць і арганізаванасьць паказваюць калгасы «Чырвоны бор» і «Маяк»**—Вялікаборскага сельсавету, **«Селянін»** — Полацкага сельсавету, **«Бальшавік»** і **«Колас»**— Пасевіцкага сельсавету, **«Расьсьвет»** і **«Чырвоны шлях»** — Алексінскага сельсавету. Калгасьнікі праяўляюць вялікі вытворчы энтузіязм у барацьбе за выкананьне плянаў, у барацьбе за высокі ўраджай. Калгас **«Чырвоны бор» ужо заканчвае сяўбу аўса.**

Аднак, у радзе іншых калгасаў першыя дні сяўбы паказалі напўнасьць раду прарываў, галоўным чынам арганізацыйнага парадку, што тармозіць разгортваньне палявых работ. **Самым слабым зьвяном зьяўляецца арганізацыя працы. Вялікая віна за гэта падае на райкалгассаюз.** кіраўніцтва якога (зараз зьменена) не правяла належнай энэргіі ў ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі па арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад. Кіраўніцтва райкалгассаюзу брала стаўку на апартуністычны самацёк у гэтай справе. Калгасы не атрымалі канкрэтных [illegible] у разных [illegible] тым, як арганізоўваць брыгады. Ня дзіва таму, што ў многіх калгасах дырэктыва выконвалася фармальна. Брыгады, праўда, арганізоўваліся, за імі нават замацоўваліся пэўныя вучасткі зямлі, але па сутнасьці гэтыя групы калгасьнікаў нічым не адрозьніваюцца ад леташніх брыгад. Аб гэтым сьведчыць той факт, што брыгады не атрымалі вытворчых заданьняў і пляну работы не абмяркоўвалі. Яны нават ня ведаюць, якія культуры павінны на сваіх вучастках сеяць, якой павінны дабівацца ўраджайнасьці. Вытворча-фінансавыя пляны ёсьць толькі ў 33 калгасах з існуючых 81.

Кулак асабліва моцную агітацыю павёў супроць арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад. Клясавы вораг, карыстаючыся адсутнасьцю належнай масавай работы і памылкамі ў арганізацыі брыгад, дапушчанымі ў радзе калгасаў, выступае са сваёй кулацкай «арытмэтыкай». Кулацкія элементы агітуюць, што работа ў паляводчай брыгадзе менш выгодная за работу ў брыгадах іншых галін. Гэты мэтаўр кулакі пачалі ўжываць якраз зараз, калі разгарнуліся палявыя работы, каб затармазіць і сарваць своечасовае правядзеньне сяўбы.

Трэба проста сказаць, што **хойніцкія раённыя арганізацыі не скарысталі генэральнай праверкі для ліквідацыі адставаньня** як на вучастку арганізацыі працы, так і мабілізацыі насельня і г. д. Зпадворна, нібыта, усё было зроблена добра. Райком паслаў у сельсаветы і калгасы 75 чалавек, якія выехалі 4-5 красавіка. Але... 9 красавіка ўсе мабілізаваныя ўжо вярнуліся ў Хойнікі і праверка фактычна лічылася скончанай. Яна толькі фармальна ідзе далей.

10 красавіка на пасяджэньні райкому выявілася, што ні адна з раённых кіруючых установ ня ведае, наколькі эфэктыўна працавалі мабілізаваныя таварышы. Між тым, некаторым брыгады і пасобныя ўпаўнаважаныя літаральна нічым практычна не дапамагалі мясцовым арганізацыям. Вось прыклады. Намесьнік старшыні РВК тав. **Бандарэнка** і загадчык райфа тав. **Івашчанка** абмежаваліся тым, што наведалі сельсавет, не зазірнуўшы нават ні ў адзін калгас. Загадчык райапчадкасы тав. **Райлін** паказаў узор гаслалёрства. Прыяжджаючы ў калгасы, ён браў ад старшыні праўленьняў расьпіскі аб тым, што яны «ня будуць разбазаваць насеньня», пасьля чаго спакойна вярнуўся назад.

Фармальнае правядзеньне генэральнай праверкі ня зрушыла з месца падрыхтоўку да сяўбы аднаасобнага сэктару, які яшчэ тут складае 59 проц. усіх гаспадарак. Праверка ня была скарыстана, каб мабілізаваць бядняцка-серадняцкія масы на поўнае выкананьне пасеўных плянаў, каб пакончыць з ігнараваньнем аднаасобніка, якое наглядаецца ў большасьці сельсаветаў.

Нічога ня зроблена, каб папулярызаваць пастанову СНКБ аб кантрактацыі як сярод калгасьнікаў, так і аднаасобнікаў.

Першыя дні сяўбы паказалі непадрыхтаванасьць раёну, калі гаварыць аб ім у цэлым, да правядзеньня бягучай пасеўнай кампаніі. З існуючым становішчам трэба рашуча і неадкладна пакончыць. Раённая партарганізацыя павінна ўзмацніць барацьбу з усялякімі прошукамі клясавага ворага і яго агентуры — правых і «левых» апартуністаў. Неабходна ўмацаваць партыйнымі сіламі вёзавыя вытворчыя зьвеньні ў калгасах. Генэральная праверка павінна быць разгорнута не па словах, а на справе. Перад партарганізацыяй стаіць задача — прыцягваючы да правядзеньня праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы шырокія масы калгасьнікаў і беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў, **дабіцца вы праўленьня недахопаў і памылак на ходу.**

Брыгада **«Зьвязды»**:
Івашын, Меднікаў, Еліневіч.

СПАБОРНІЧАЮЦЬ НА ХУТЧЭЙШАЕ СКАНЧЭНЬНЕ СЯЎБЫ

СЛУЦАК. (Па тэлеграфу).

Калгас «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА», Старыкаўскага сельсавету, пачаў палявыя работы. Чатыры паляводчыя брыгады, арганізаваныя паводле вытворчага прынцыпу, 14-га красавіка засеялі 30 га аўса. 15 красавіка гэтыя-ж брыгады засеялі 11,5 га аўса і ўзаралі 10,8 га.

Брыгада № 1 абвясьціла сябе ўдарнай імя трэцяй бальшавіцкай вясны і выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае і хутчэйшае правядзеньне сяўбы брыгаду № 3.

Брыгада № 3 выклік прыняла і выклікала астатнія брыгады.

Усе брыгады ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай і поўнае выкананьне пасеўнага пляну.

Калгас поўнасьцю забясьпечан насеньнем і пачаў палявыя работы зусім падрыхтаваным.

Гэта выклікала новы прыліў у калгас. 13 красавіка, напярэдадні выхаду ў поле, 5 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак уступілі ў калгас і адразу-ж прыступілі да работы. Усяго ў калгасе зараз 170 гаспадарак.

ХАРЫТОНЧЫК, ПЯРУШКІН.

Самацёк

ЕЛЬСК. Па Ельскім раёне веснавая сяўба пачалася 12 красавіка. У гэты дзень бюро райкому партыі пастанавіла пераключыць усю сваю работу на выкананьне плянаў веснавой сяўбы. Былі вылучаны адказныя людзі для накіраваньня ў сельсаветы і калгасы.

16 красавіка палова вылучаных таварышоў яшчэ сядзела ў раённым цэнтры. Мабілізаваныя абапалоў [illegible] пароті райкому, каб аслабаніцца ад паездкі.

Пачатак сяўбы праходзіць самацёкам. Ні старшыня РВК, ні загадчык райза, ні старшыня райкалгассаюзу не пацікавіліся выехаць на месцы, каб азнаёміцца са становішчам рэчаў. Ня дзіва, што гэтыя арганізацыі ня ведаюць, як ідзе сяўба.

Прывезеныя факты сьведчаць аб тым, што пастанова бюро райкому пакуль што засталася на паперы. Партыйныя арганізацыі Ельшчыны павінны неадкладна па справе пераключыцца на бальшавіцкае правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі. Неабходна зараз-жа паладзіць жывое, апэрацыйнае кіраўніцтва сяўбой. Раённыя зямельна-калгасныя арганізацыі абавязаны штодзённа [illegible] быць у курсе таго, што робіцца ў сельсаветах і калгасах, каб мець магчымасьць адразу-ж ліквідаваць выяўленыя недахопы.

Брыгадзір «Зьвязды»
П. Е. МАКЕЕЎ.

Сеюць рукамі, а радковыя сявяркі ляжаць разабранымі

ЕЛЬСК, 17/IV. Сяўба аўса па раёне ў самым разгары. Ня гледзячы на тое, што ў кожным калгасе ёсьць радковыя сявяркі, усюды сеюць рукамі.

Гэта вынік ні чым неабгрунтаваных разважаньняў, што «сявяркай сеяць ня варта, бо цяжка коням і яна грузьне ў зямлі». Гэтыя шкодныя разважаньні падтрымліваюцца кіраўнікамі райза і райкалгассаюзу.

Неабгрунтаванасьць такіх цьверджаньняў выявілася на праверцы работы сявяркі ў полі. Аказалася таксама, што рад калгасаў нават і не прабавалі пусьціць сявярку ў ход. Сявяркі яшчэ і зараз ляжаць разабранымі — у такім выглядзе, як яны былі складзены па зімоўку.

Цэнтральныя зямельныя арганізацыі павінны неадкладна ўжыць рашучыя меры да поўнага скарыстаньня саўпрак. **Настроі і гутаркі супроць радковай сяўбы павінны сустрэць самы жорсткі адпор, як настроі, якія перашкаджаюць ажыцьцяўленьню бальшавіцкай праграмы барацьбы за высокі ўраджай і якія толькі на руку кляса ваму ворагу.**

З.

Месьніцкія тэндэнцыі Прышчэпава

Уваравічы.

У саўгасе **«Уваравічы»**, у дапаможнай гаспадарцы Кісялёўшчына (Уваравіцкі раён) ёсьць лішкі грубых кармоў — сена, саломы і інш. Але хаваньне гэтых кармоў зусім дрэннае. Значная частка іх усю зімку знаходзіцца пад адкрытым небам і пачала псавацца.

Рабочыя ня раз заяўлялі загадчыку гаспадаркі Прышчэпаву аб неабходнасьці перадаць лішкі кармоў суседнім гастасам і калгасам, якія адчуваюць недахват кармоў. Прышчэпаў на заявы рабочых не зварачае ніякай увагі.

Рабочыя патрабуюць прыцягненьня да адказнасьці вінаватых у разбазаваньні і псаваньні кармоў.

Котава, Кабаева, Сінклета.

НЕАДКЛАДНА ВЫВЕЗЬЦІ ЎГНАЕНЬНІ

349 тон штучнага ўгнаеньня валяецца пад адкосам

Хэмізацыя сельскай гаспадаркі выяўляецца адным з рашаючых фактараў атрыманьня высокага і ўстойлівага ўраджаю.

У бягучым годзе мы павінны дабіцца вялізарнейшых зрухаў у павышэньні ўраджайнасьці нашых палёў. Як-жа стаіць справа па БССР з забясьпячэньнем трэцяй бальшавіцкай сяўбы мінеральнымі ўгнаеньнямі?

У БССР на 10-IV плян завозу выканан на 37,6 проц., галоўны чынам, за лік фасфарытнай мукі, якой адгружана 60 проц., сільвініта—16 проц. і растваральных фасфарытаў —14,9 проц. Беладзяленьнем штучных угнаеньняў адгружана саўгасам 45,6 проц., райкалгассаюзам — 46,2 проц., МТС—22,1 проц. пляновага заданьня.

Невыкананьне пляну адгрузкі мінэральных угнаеньняў тлумачыцца недавыкананьнем пляновага заданьня прамысловасьцю.

Гэта абавязвае ўсе гаспадаркі і арганізацыі больш рацыянальна выкарыстаць кожны кілёграм угнаеньняў. Між тым, у радзе раёнаў з боку калгасаў, МТС і саўгасаў ёсьць недапушчальныя адносіны да выкарыстаньня прыбываючага ўгнаеньня.

На чыгуначных станцыях угнаеньні, якія прыбываюць у адрас райкалгассаюзаў, МТС і саўгасаў валяцца пад адкосамі, мокнуць на дажджы, а якія прыбывалі раней, ссыпаліся і зьмешваліся са сьнегам.

Такі факт меў месца на станцыі Градзянка, дзе тры вагоны супэрфасфату, якія паступілі саўгасу «Маладая гвардыя», былі выгружаны ў сьнег, у выніку чаго палова сапсавалася.

Так, на станцыі валяцца пад адкосам адгружанае ўгнаеньне для плешчаніцкай МТС у ліку трох вагонаў, для лагойскага райкалгассаюзу —два вагоны, саўгасу «Уваравічы» (Уваравіцкі раён)—тры вагоны, саўгасу «Старая Беліца»—два вагоны, слуцкага лесрамгасу—18 тон, асіпавіцкага лесрамгасу—54 тоны, саўгасу «Капацэвічы» (Касьціковіцкага раёну)—63 тоны, саўгасу «Вызваленьне» (Смалявіцкага раёну) — 54 тоны.

Такіх гнілых прыкладаў можна было-б прывесьці яшчэ больш.

За недапушчальныя адносіны да выкарыстаньня прыбываючага на станцыю ўгнаеньня вінаватыя павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці. Разам з разгорнутай барацьбой за мінэральнае ўгнаеньне павінна быць разгорнута мабілізацыя мясцовых відаў угнаеньняў (попел, торф, вапна, адкіды прамысловых прадпрыемстваў і г. д.).

ПОПЕЛУ НЯ ЗЬБІРАЮЦЬ

Слуцак.

На прадпрыемствах і ўстановах гор. Слуцку ёсьць вялікія залежы попелу. Так, напрыклад, у тэхнікуме ёсьць 2 тоны, мальне «Ухход» — 1 тона попелу і больш за 500 пудоў угнаеньня, пякарні гарспажыўтаварыства — 3 тоны і сталоўцы № 1 — 1 тона.

Попел не захоўваецца і можна пад дажджом. Аднак, гэтай справай ніхто ня цікавіцца, ня гледзячы на тое, што гэтыя прадпрыемствы зварочваліся да сацінкоўленых райарганізацый.

В. Б.

Узьняцьце прадукцыйнасьці жывёлагадоўлі—немагчыма бяз удзелу кожнага калгасьніка

З адозвы калгасу „Маяк сацыялізму", Стасеўскага сельсавету, Лёзьнянскага раёну

Ільнаводча-жывёлагадоўчы калгас «Маяк сацыялізму», Стасеўскага сельсавету, Лёзьнянскага раёну, які яднае 105 гаспадарак і 13 адзіночак, пад кіраўніцтвам раённай партарганізацыі, дабіўся значных посьпехаў у галіне разьвіцьця ільну і таварнай малочнай гаспадаркі.

Летась было засеяна 176,5 гэкт. ільну. Сёлета плошча пад ільном павялічваецца на 43,4 проц. і займае 253 гэкт., што складае 34,1 проц. яравога кліну.

МТФ калгасу мела на 1 студзеня 1932 году 78 штук прадукцыйнай жывёлы і 67 штук маладняка. У 1932 г. стада дойных кароў будзе павялічана да 100 штук і маладняка да 90 штук. У мінулым годзе дзяржаве было здана 204 цэнт. малака, або 73 проц. пляну; на гэты год вызначана здаць 824 цэнт.

Аднак, усе гэтыя посьпехі яшчэ не выражаюць задачы пашырэньня стада прадукцыйнай жывёлы.

«Задачу пашырэньня стада і гадаваньня маладняка ў калгасах сёньня нельга вырашыць без актыўнага ўдзелу ў гэтай справе кожнага калгасьніка».

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 26 сакавіка і ЦК КП(б)Б у пастанове ад 3 красавіка паказваюць выразныя шляхі вырашэньня гэтай задачы.

У адказ на пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б мы абавязваемся на працягу гэтага году ажыцьцявіць наступныя мерапрыемствы:

—Дабіцца, каб у кожнага калгасьніка ў сваім карыстаньні была ня толькі свая карова, але і дробная жывёла: парсяты, сьвіньні, авечкі, куры і інш. птушка.

Дасягнуць гэтага мы мяркуем наступным чынам:

Поўнасьцю захаваць прыплод сёлетняга ацёлу кароў, якія знаходзяцца ў карыстаньні калгасьнікаў.

Акрача таго, калгас прадасьць калагасьнікам, якія ня маюць дробнай жывёлы, частку прыплоду МТФ і аграмаджанага стада дробнай жывёлы і тым самым дапаможа ім выгадаваць жывёлу для асабістых патрэб.

На аснове правільнай арганізацыі працы і паляпшэньня догляду, мы выпачаем павялічэньне прадукцыйнасьці жывёлагадоўлі на 100 проц. Удой каровы ў гэтым годзе мы давядзем у сярэднім да 1.400 літраў, замест 715 у мінулым годзе. Не дапусьцім н'водная выпадку адыходу маладняка.

Вырашэньне ўсіх гэтых задач немагчыма без стварэньня ўласнай кармовай базы.

У парадку сустрэчнага пляну мы пашыраем засеў кармовых траў на 2 гэк. і сіласных культур на 6 гэкт. Намі будзе засіласавана 12 гэкт. сіласных культур, 72 гэкт. бульбяніку і ўсё бацьвіньне як з калгасных гародаў, так і гародаў, якія знаходзяцца ў карыстаньні пасобных калгасьнікаў.

Уся жывёла як аграмаджаная, так і не аграмаджаная, будзе забясьпечана кармамі поўнасьцю.

Мы зьвяртаемся да ўсіх калгасьнікаў і калгасьніц Лёзьнянскага раёну і ўсёй БССР з заклікам паследаваць нашаму прыкладу і прыняць канкрэтныя самаабавязацельствы па гадаваньні малочнай і дробнай жывёлы як на МТФ і ў калектыўных стадах, так і ў аднаасобным карыстаньні калгасьнікаў. У гэтым — адна з важнейшых умоў арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў у іх арцельнай форме, у гэтым—шлях да вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы.

Стварэньне ўласнай кармовай базы —баявая задача кожнага калгасу.

ПА ДАРУЧЭНЬНІ АГУЛЬНАГА СХОДУ КАЛГАСУ „МАЯК САЦЫЯЛІЗМУ":
СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ—ЯГОР БУКІН.
ЧЛ. ПРАЎЛЕНЬНЯ: МАРКАЎ ВАСІЛЬ (БРЫГАДЗІР), ШЛЯКОЎ ХВЁДАР, РОСЛАЎ ІВАН (БРЫГАДЗІР), ШТЫЛІКАЎ, МАКСІМ (БРЫГАДЗІР), КІЯЖШЧА ЯЗЭП (ПАЛЯВОД), КАРАЛЁЎ МІЧЫПАР (ЗАГ. МТФ), ЗАРАКОЎСКІ ЎЛАДЗІМІР (РАХУНКАВОД), ЯНУШКОЎСКІ ХВЁДАР (РЭДАКТАР НАСЬЦЕНГ

СЁНЬНЯ АДКРЫВАЕЦЦА ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПА ЯКАСЬЦІ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

УЗЬНЯЦЬ ЯКАСЬЦЬ МЯСАПРАДУКТАЎ!

Ператварыць саматужныя бойні ў буйныя мэханізаваныя мясныя камбінаты

ШТО ПАВІННА ЗРАБІЦЬ КАНФЭРЭНЦЫЯ

Першая ўсебеларуская канфэрэнцыя па якасьці харчовай прамысловасьці сыстэмы Наркамснабу, якая сёньня адкрываецца, мае выключнае значэньне. Асноўная ідэя канфэрэнцыі заключаецца ў тым, каб шляхам супольнага абгаварэньня пытаньня з лепшымі ўдарнікамі заводаў выявіць прычыны, знайсьці спосабы зжыцьця нядобраякаснасьці харчовай прадукцыі.

Харчовая прамысловасьць дасягнула вялізарных посьпехаў за апошнія гады. Даволі паказаць, што ўкладаньні ў капітальнае будаўніцтва на харчовай прамысловасьці за тры гады пяцігодкі складаюць 120 проц. укладаньняў, вызначаных пяцігадовым плянам. Выпуск валавой прадукцыі дасягнуў 160 млн. руб. Пушчаны новыя мэханізаваныя прадпрыемствы— мясакамбінаты, млыны, элеватары, алейні, кандытэрскія фабрыкі і г. д. У бліжэйшыя дні будзе пушчан гомельскі маргарынавы завод. Прыступлена да будаўніцтва буйнейшага ў БССР і Заходняй вобласьці магілёўскага мясакамбінату. Канчаецца тэхнічна - эканамічнае абгрунтаваньне першага ў БССР гародна - кансэрвовага заводу, магутнасьцю у 30 мільёнаў банак у год. Воляй рабочай класы, пад кіраўніцтвам партыі, разгромлены, саматужны, харчовы прамысел ператвараецца ў буйную мэханізаваную сацыялістычную харчовую індустрыю. Аднак, усе гэтыя посьпехі ня могуць нас задаволіць. Бязупынны рост культурных і матар'яльных запатрабаваньняў рабочае класы патрабуе ўсямернага паляпшэньня абслугоўваньня працоўных мас. Гэта накладвае асаблівыя абавязкі на харчовую прамысловасьць БССР.

БССР зьяўляецца раёнам, у якім харчовая індустрыя можа разьвівацца пераважна на мясцовым сырцы. Мы-ж ня толькі надзвычай слаба выяўляем повыя рэсурсы, але зусім невыстарчальна скарыстоўваем тое, што ў нас ёсьць. Значная частка дасягненьняў зьнижаецца тым, што якасныя паказальнікі ў рабоце харчовай прамысловасьці зусім нездавальняючыя. Гэта асабліва адносіцца да якасьці нашай прадукцыі.

Праведзенае брыгадамі інжынэрна-тэхнічных работнікаў, сумесна з ударнікамі заводаў, абслядаваньне 20 буйнейшых прадпрыемстваў выявіла ў асноўным прычыны нізкай якасьці харчовай прадукцыі. На надыходзячай канфэрэнцыі мы павінны дэтальна разглядзець увесь сабраны матар'ял, падрабязна абгаварыць яго ў адпаведных галінных сэкцыях.

На аснове пастаноў канфэрэнцыі ўсе арганізацыі павінны будуць пабальшавіцку змагацца за паляпшэньне якасьці прадукцыі.

Калегія Наркамснабу ўпэўнена ў тым, што ўсе работнікі харчовай прамысловасьці, пад кіраўніцтвам партарганізацый, прыйдуць да канца 4-га заключнага году з выкананьнем колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну.

Нам. Наркамснабу БССР — **Васкабойнікаў.**

Кіраўніцтва аршанскім мясакамбінатам яшчэ не перабудавана

Аршанскі мясакамбінат зьяўляецца прадпрыемствам усесаюзнага значэньня. Ён снабжае мясапрадуктамі ня толькі рабочыя цэнтры БССР, але і прамысловыя цэнтры Саюзу. Удзельная вага прадукцыі аршанскага мясакамбінату складае 40 проц. у адносінах да прадукцыі ўсіх камбінатаў БССР. Таму зусім зразумела, што пытаньню якасьці работы камбінату трэба аддаць выключную ўвагу.

На камбінаце існуе бюро стандартызацыі. Але яно ніякай работы па ўкараненьні стандартаў не вядзе. Яно толькі займаецца рэгістрацыяй фактаў выпуску нестандартнага прадукту. У перадубойным цэху няма доглядзу за жывёлай, у выніку чаго выпадкі падзяжу жывёлы. Пры здыманьні скур дапускаецца шмат браку: замест нармальных 70 проц. скур першага гатунку, выпускаецца толькі 25 проц. На скурах застаецца шмат сала — па буйнай жывёле колькасьць сала даходзіць да 2 клгр. на штуку.

У каўбасным цэху — антысанітарнае становішча.

У цэхах няма гаспадарчага разрахунку. Аб эканоміі толькі гавораць, але не праводзіць яе ў жыцьцё. Няма ніякага прэміраваньня за лепшыя паказальнікі на зьмяншэньні браку. Рабочыя прапановы марынуюцца па 3-4 месяцы. На працягу апошніх трох месяцаў паступіла 30 рабочых прапаноў і толькі тры з іх разглядваны. Прэміраваньне за лепшыя рацыяналізатарскія прапановы не праводзілася.

Нядаўна дырэктар камбінату Казак, згодна пастановы камісіі выкананьня СНК СССР, зьняты з работы і адданы пад суд за бесгаспадарчасьць і агідную пастаноўку працы. Але Белмясапрамтрэст дагэтуль амаль нічога не зрабіў, каб аздаравіць работу камбінату.

З. Л.

Машыны для афарбоўкі дражэ на фабрыцы «Камунарка».

Сацыялістычныя рахункі цэхай — [illegible] сілага мясакамбінату

На менскім мясакамбінаце разгарнулася шырокая падрыхтоўка да палыхадзячай канфэрэнцыі па якасьці прадукцыі харчовай прамысловасьці. На зьлётах ударнікаў абмяркоўваюцца пытаньні якасьці тых прадуктаў, якія выпрацоўваюцца камбінатам.

Менскі мясакамбінат мае рад дасягненьняў у галіне якасьці работы. Гэта ставіць яго на адно з першых месц сярод мясакамбінатаў БССР. Калі ў 1931 годзе скуры першага гатунку па буйнай рагатай жывёле складалі 87 проц., дык за першы квартал г. г. яны ўжо складаюць 98 проц. Калі ў 1931 годзе брак скур складаў 4 проц., дык у першым квартале ён зьніжан да 1-го проц. Есьць паасобныя ўдарнікі, як т. т. **Вуйн, Глямжэнгаўз, Мінкін,** якія вельмі добра апрацоўваюць скуры і даюць брак да нуля. Есьць дасягненьні і ў кішочным цэху. Брак там даведзен да 1,55 проц. замест плянавых 3 проц. Паасобныя ўдарнікі якасьці, як тав. **Куркула, Файн, Залінскі** давялі брак да нуля. Побач з гэтым, трэба адзначыць, што ёсьць рабочыя, якія сыстэматычна выпускаюць брак, як тав. **Канэвін і Ліхтэрман.**

Альбуміны цэх заняў другое месца ў СССР па выпуску вельмі жаштоўнага дэфіцытнага прадукту. Замест плянавых 70 проц. бялковых матэрый у альбуміне, ёсьць бляку да 85 проц. Гэта дасягнута таму, што майстар цэху тав. **Кункін** вядзе энэргічную барацьбу за якасьць.

Адстае камбінат у галіне скарыстаньня жывой вагі жывёлы. Калі ў 1931 годзе жывая вага буйнай жывёлы скарыстоўвалася на 66,7 проц., дык у першым квартале гэта лічба зьнізілася да 65,3 проц., а па цялятах замест 60,15 проц. — 53,1 проц. і г. д.

У апошні час быў праведзен пробны ўбой, які паказаў, што пры добрай арганізацыі скарыстаньне жывой вагі жывёлы можа дасягнуць 75 проц. Трэба адзначыць таксама антысанітарнае становішча ў цэхах, асабліва ў быкабойным.

Адстае прадукцыя каўбаснага цэху. Ёсьць выпадкі, далі для фаршу падаюцца забруджаныя кішкі, калі каўбаса дрэнна кошціцца і выходзіць бяз колеру і смачная.

Зьлёты ўдарнікаў якасьці каўбаснага цэху прад'явілі сацыялістычны рахунак быкабойнаму цэху, які часта падае брудныя мяса, збой і ногі. Кішочны цэх прад'явіў сацыялістычны рахунак быкабойцам, абвінавачваючы іх у тым, што яны часта неасьцярожна абыходзяцца з кішкамі. Быкабойны цэх у сваім рахунку халадзільніку адзначыў, што апошні дрэнна захоўвае сала, якое паступае ў каўбасны цэх. Гэты-ж цэх прад'явіў рахунак скотнай базе камбінату, якая ня ўважліва даглядае жывёлу, прызначаную да ўбою.

БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ». — Манусевіч, Саўко, Уялёўская, Левін, Руцько.

РАБОЧЫЯ ПРАПАНУЮЦЬ

У быкабойным цэху менскага мясакамбінату ёсьць яшчэ рад унутры-заводзкіх непаладкаў, якія ўплываюць на якасьць прадукцыі. Трэба неадкладна перанесьці ў асобны пакой працэс мыйкі і вытрускі са страўнікоў, каб не забруджіць чыстага мяса. Убой і разборка жывёлы не павінны адбывацца на адным месцы. Трэба паставіць новыя калодкі з нахілам для сьцёку для рубкі ног, што дасьць лепшае скарыстаньне мяса. Трэба абмываць жывёлу перад убоем яе, каб не пераносіць бруду на мяса. Неабходна прадоўжыць на некалькі мэтраў шлях саматаскі з халадзільніка на бойню, што дасьць эканомію рабочай сілы.

Рабочы быкабойнага цэху— КАЦНЭЛЬСОН.

***

Кішочны цэх патрэбуе неадкладнага зьнішчэньня непаладкаў у быкабойным цэху, якія перашкаджаюць рабоце. Быкабойны цэх не павінен трымаць тушы жывёлы на зямлі, бо з-за гэтага кішкі трацяць патрэбную трывапасьць. Сушыльнае аддаленьне часта не забясьпечана дровамі, з прычыны чаго не хапае пару і псуюцца надутыя кішкі.

У кішочным цэху няма вэнтыляцыі, што пагаршае ўмовы працы. Адміністрацыя дагэтуль не нападзіла правільнага хаваньня кішак, асабліва ўлетку. Паведець, што пабудавана для гэтай мэты, цячэ. Раскатку кішак для наданьня мягкасьці потам робяць на траве, трэба пабудаваць для гэтага спэцыяльны насьціл з дошак.

Па даручэньні рабочых кішэчнага цэху — Г. ЛЕДАР.

Романоўскі—старшы майстар—ударнік быкабойнага цэху менскага мясакамбінату.

Масавая самаправерка перабудовы рабселькораўскага руху

Абвешчаны ЦК і ЦКК КП(б)Б усебеларускі месячнік масавай праверкі і самаправеркі ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК УсеКП(б), ЦК і ЦКК КП(б)Б па пытаньнях рабселькораўскага руху і пайрыхтоўкі газэтных кадраў мае вялізарнае палітычнае і практычнае значэньне.

Праграма правядзеньня самаправеркі дае выразную ўстаноўку, што ўся работа па месячніку павінна быць насычана глыбокім зьместам, барацьбой за чарговыя задачы партыі. Правядзеньне месячніка павінна быць адзначана яшчэ большым узмацненьнем работы па конкурсе «Правды» і ўсебеларускім сталінскім паходзе фабрычна-заводзкага друку.

Посьпехі месячніка мы павінны забясьпечыць з першага-ж дня ПРАВІЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ РАБОТЫ, дакладнай расстаноўкі сіл, дыфэрэнцыраваным разьмеркаваньнем работы па месячніку паміж рознымі арганізацыямі. Трэба памятаць, што работа «изогул» ніякіх канкрэтных вынікаў ня дасьць.

Масавая самаправерка ажыцьцяўленьня партыйных пастаноў па пытаньнях рабселькораўскага руху павінна быць скончана У АСНОЎНЫМ у нізавых арганізацыях да 5-га мая. Апошняя дэкада месячніка (5-15 мая) скарыстоўваецца, галоўным чынам, на падагульненьне вынікаў самаправеркі нізавых арганізацый і складаньне агульных выводаў па раёне.

Пры праверцы выкананьня партыйных пастаноў шляхам правядзеньня рэй даў супольных брыгад рэдакцый газэт і КК РСІ, трэба ўнікаць агульнага, неканкрэтнага падыходу, імкненьня правесьці самаправерку «адным махам». Трэба ўсю гэту работу канкрэтызаваць, узяўшы пастановы ЦК УсеКП(б), ЦК і ЦКК КП(б)Б і мясцовых партыйных органаў і па КОЖНЫМ асобным пункце правесьці дэтальную праверку, выявіць і падагуліць дасягненьні, якія ёсьць у выніку выкананьня гэтых пастаноў, выкрыць недахопы, выявіць канкрэтных вінаватых у невыкананьні партыйных пастаноў.

Ні ў якім разе нельга абмежавацца арганізацыяй толькі аднаго рэйду па ўсіх пытаньнях. Такі рэйд станоўчых вынікаў ня дасьць. Трэба работу па самаправерцы падзяліць на некалькі вузлавых пытаньняў. Прыкладна — правесьці адзін рэйд па пытаньні разгортваньня ўдарніцтва ў друку, другі рэйд па пытаньні канкрэтызацыі і спэцыялізацыі работы газэты на аснове выкананьня пастаноў 2-га ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў, [illegible] — па пытаньні праверкі рэагаваньня на заметкі рабселькораў і давядзеньне да канца ўзьнятых газэтай пытаньняў і г. д. Асобна трэба правесьці праверку становішча разгортваньня работы па конкурсе «Правды» і сталінскім паходзе, в таксама становішча кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькорамі з боку нізавых партыйных арганізацый.

На мясцох павінен быць распрацован канкрэтны, каляндарны плян месячніка з паказаньнем адказных выканаўцаў за правядзеньне кожнага асобнага пункту, кожнага намечанага плянам мерапрыемства.

Дакладна павінна быць разьмеркавана работа па правядзеньні месячніка і сярод цэнтральных газэт. Газэта «РАБСЕЛЬКОР», апрача агульнай работы па месячніку, узяла на сябе канкрэтны абавязак — арганізаваць асаблівае дэтальную самаправерку выкананьня пастаноў 2-га ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў на прадпрыемствах дрэваапрацоўчай прамысловасьці, г. зн. на прадпрыемствах тэй сэкцыі, якой «Рабселькор» кіраваў на 2-м усебеларускім зьезьдзе рабселькораў. Для гэтай работы, на вольту мінулага году, БУДУЦЬ ШЫРОКА ПРЫЦЯГНУТЫ ДЛЯ СУПОЛЬНАЙ ПРАЦЫ ПРАФСАЮЗНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ І ІТР. Асатнія цэнтральныя газэты БССР, па прыкладу «Рабселькора», павінны таксама ўзяць, апрача агульнай работы па месячніку, канкрэтныя абавязкі па арганізацыі і правядзеньні дэтальнай самаправеркі на прадпрыемствах тых сэкцый, якімі яны кіраваці на 2-м усебеларускім рабселькораўскім зьезьдзе.

Камсамольскія арганізацыі павінны ў першую чаргу сканцэнтраваць увагу ў сваёй рабоце на разгортваньні месячніка на пытаньні падрыхтоўкі газэтных кадраў. Месячнік павінен паслужыць пачаткам масавай работы па вярбоўцы студэнтаў на газэтныя аддзяленьні камвузу, Беларускага вышэйшага педагагічнага інстытуту, гомельскай саўпартшколы, магілёўскага політасьветтэхнікуму і педтэхнікуму. Асеньні набор гэтага году зьвыш 400 новых студэнтаў газэтных аддзяленьняў павінен прайсьці АРГАНІЗАВАНА. У прыватнасьці, для гэтага трэба ўжо зараз у раёнах і буйных прадпрыемствах стварыць ТРОЙКІ САДЗЕЙНАСЬЦІ АРГАНІЗАВАНАМУ НАБОРУ кадраў будучых газэтных работнікаў. У гэтыя тройкі павінны ўваходзіць прадстаўнікі ад партыкому, рэдакцыі газэты і камітэту камсамола.

У галіне ўзмацненьня і канкрэтызацыі партыйнага кіраўніцтва рабселькораўскім рухам і нізавым друкам трэба перш за ўсё неадкладна выканаць пастанова ЦК УсеКП(б) аб стварэньні пры парткамітэтах камісій па кіраўніцтве рабселькорамі і нізавым друкам. Гэтыя камісіі павінны сыстэматычна на сваіх пасяджэньнях абмяркоўваць ва ноўныя пытаньні рабселькораўскага руху, ставіць даклады нізавых партыйных ячэек і рэдактароў газэт, стварыць вакол сябе шырокі актыў з асяродзішча рабселькораў-ударнікаў. Багацейшы вопыт апэрацыйнай работы лепшых камісій (Гомель, Віцебск, Жлобін і г. д.) па кіраўніцтве конкурсам «Правды» і штабаў па кіраўніцтве сталінскім паходам (у прыватнасьці, практыка выязных пасяджэньняў, заслухоўваньне тэматычных дакладаў раду газэт, перанясеньне больш важных пытаньняў на пасяджэньне партыйных камітэтаў) — трэба поўнасьцю скарыстаць у рабоце камісіі па кіраўніцтве рабселькораўскім рухам і нізавым друкам. Асаблівы ўпор у сваёй рабоце камісіі павінны зрабіць праверку выкананьня партыйных пастаноў па пытаньнях рабселькораўскага руху.

Рашуча пакончыўшы з усякімі апартуністычнымі «разважаньнямі» і «дыскусіямі», якія ёсьць у асобных мясцох на тэму «патрэбны, ці непатрэбны рабселькораўскія камісіі», «ці будуць яны жыцьцёвыя, ці ня будуць...», трэба ў самы бліжэйшы час ва ўсіх раёнах, пры ўсіх партыйных камітэтах арганізаваць камісіі, ператварыўшы іх у баявыя апэрацыйныя штабы кіраўніцтва рабселькораўскім рухам і нізавым друкам.

Вынікі месячніка павінны яшчэ больш узмацніць бальшавіцкую пільнасьць нізавога друку і рабселькораў у барацьбе за генэральную лінію партыі, супроць правага ўхілу — галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» загібшчыкаў і прымірэнцтва да ўхілаў.

Нарэшце, мы яшчэ раз напамінаем, што месячнік самаправеркі павінен быць самым глыбокім чынам пранізан канкрэтнай работай па яшчэ большай мабілізацыі рабочых, калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну па ўсіх яго колькасных і якасных паказальніках, на бальшавіцкае правядзеньне веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі.

Вынікі месячніка масавай праверкі павінны адлюстравацца ў паказальніках лепшай работы цэхаў і брыгад, у баявым разгортваньні бальшавіцкай сяўбы на сацыялістычных палёх.

Такіх і толькі такіх вынікаў мы чакаем ад месячніка масавай праверкі і выкананьня партыйных пастаноў па самаправерцы [illegible] пытаньнях рабселькораўскага руху.

Ударнікі дэлегаты БССР на IX усесаюзны зьезд прафсаюзаў

У дэлегацыю БССР на IX усесаюзны зьезд прафсаюзаў, выбраную VII усебеларускім зьездам і некаторымі саюзнымі канфэрэнцыямі, апрача сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Жаброўскага**, старшыні ЦСПСБ тав. **Рыжова**, сакратара ЦСПСБ тав. **Кавалёва, Шульціна, Беленькага, Разумава, Берзінга, Халфіна, Кантарэвіча, Карначова, Камэнштэйна, Клімковіча, Плешакова** і раду інш., уваходзіць **7 рабочых і работніц, доктар і настаўніца.** Усе яны — лепшыя ўдарнікі, па некалькі разоў прэміраваныя за добрую работу. Вось іх кароткія біяграфіі.

Лунгін Якаў Іосіфавіч, каменшчык Менбуду, рабочы стаж — 30 год. Яго брыгада на працягу апошніх год сыстэматычна перавыконвае нормы, дае лепшыя ўзоры якасьці работы. Тав. Лунгін — удзельнік усесаюзнага рэкорду па цагельнай кладцы: у яго брыгадзе каменшык Дворкін уклаў за тры гадзіны да 10.000 цаглін. Тав. Лунгін — член прафсаюзу з 1917 году, адзін з арганізатараў саюзу будаўнікоў у Менску. І зараз прымае актыўны ўдзел у прафсаюзным жыцьці, узначальваючы ЦБ сэкцыі каменшчыкаў.

Таміла Тацьцяна — трактарыстка-ўдарніца Танескай МТС, Чырвонаслабодзкага раёну. Настолькі добра аўладала тэхнікай трактара, што ў мінулым годзе ішла наперадзе іншых па выкананьні плянавых заданьняў: замест нормы узорваньня 7 гэкт. у 21 гадзіну, яна ўзорвала 7,6 гэкт. за 20 гадзін, эканомячы на кожным гэктары па 2,5 кгр. гаручага. За добрую работу атрымала ганаровую грамату, была прэміравана паездкай на Сталінградзкі трактарны завод.

Баран — рабочы - ўдарнік гуты «Пралетары», сацыялістычны памесьнік старшыні крымінальна - касацыйнай калегіі Вярхоўнага суда. На працягу 9 месяцаў сацыялістычнага суміменьніцтва паказаў сябе як здольны і ўдумлівы работнік. На заводзе прэміраван, як лепшы ўдарнік. Выбран на зьезд усебеларускай канфэрэнцыяй работнікаў дзяржаўных устаноў.

Дзергачоў — партызан грамадзянскай вайны, тарфяшчык, брыгадзір лепшай брыгады тарфяшчыкаў на торфзаводзе «Закрапынскі мох». На працягу двух сэзонаў яго брыгада перавыконвала нормы. Тав. Дзергачоў тры разы прэміраваны. Тры брыгады, у тым ліку брыгада Дзергачова, забясьпечылі выкананьне праграмы 1931 году на 113 проц., за што завод атрымаў ад Саюзторфу прэмію ў 5.000 руб.

Дарожкін В. І. — токар віцебскага дэпо, рабоч стаж — 16 год, лепшы ўдарнік, пікалькі разоў прэміраваны.

Фрэйнклах — работніца швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» — лепшая ўдарніца, прымае актыўны ўдзел у грамадзкай рабоце, член прафсаюзу з 1919 году.

Фартунатава — работніца фанэрнага цэху бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату. Камсамолка, актыўная ўдзельніца гаспадарча-разрахункавай брыгады.

Марзон — доктар - хірург гор. Бабруйску, актыўны грамадзкі работнік.

Рудніцкая — настаўніца гарадоцкай сямігодкі, ударніца, грамадзкая работніца. Дабілася рашучага зруху ў політэхнізацыі школы, у выкананьні праграмы. Прымае актыўны ўдзел у арганізацыях вучняў, у ліквідацыі непісьменнасьці.

Н. ПАПОЎ

Яшчэ аб красавіцкіх тэзісах Леніна

Пятнаццаць год назад **Ул. І. Ленін** пасьля прыезду з эміграцыі выступіў са сваімі славутымі тэзісамі **«Аб задачах пралетарыяту ў данай рэвалюцыі».** Галоўны зьмест тэзісаў зводзіўся да таго, што і пасьля зьвяржэньня царскага ўраду, пры часовым урадзе, вайна застаецца для Расіі імпэрыялістычнай, грабежніцкай, што ніякага падтрыманьня часоваму ўраду, які вядзе гэту вайну пад гегемоніяй англійска-францускага капіталу, з боку партыі і рабочай класы быць ня можа, што перад партыяй стаіць задача **пераходу ад першага этапу рэвалюцыі** (зьвяржэньне царызму) **да другога** (зьвяржэньне буржуазіі), задача **ажыцьцяўленьня сацыялістычнай дыктатуры рабочае класы і бяднейшага сялянства.**

У новай ажыцьцяўленьня гэтай дыктатуры Ленін ліцыў прыцягненьне партыяй на свой бок асноўных пралетарскіх і паўпралетарскіх мас, частка якіх праяўляла «несьвядомую даверлівасьць» у адносінах да капіталістаў і іх ураду, добрасумленна даючы сябе ашукваць «рэвалюцыйна-абарончай» фразай. А форму ажыцьцяўленьня дыктатуры пралетарыяту і бяднейшага сялянства Ленін бачыў у ператвараньні саветаў, створаных пераможнай лютаўскай рэвалюцыяй, у органы дзяржаўнай улады, у стварэньні **дзяржавы савецкага тыпу.** Правядзеньне нацыянальнай зямлі, банкаў, капітала пад выкананьне, неадкладна прапанова сапраўды дэмакратычнага міру ўсім народам — вось бліжэйшыя практычныя задачы, якія Ленін ставіў перад савецкай уладай.

Нарэшце, Ленін прапанаваў партыі ў тэзісах неадкладна ўзяць на сябе ініцыятыву стварэньня **III Інтэрнацыяналу** супроць сацыял-шавіністаў і супроць цэнтру, дапоўніць праграму характарыстыкай імпэрыялізму і патрабаваньнем дзяржавы-камуны (што для Леніна зьяўлялася сынонімам савецкай дзяржавы) і зьмяніць назву.

Трацкісцкія кантрабандысты вельмі настойліва прапагандавалі тэзіс, што па партыю тэзісы Леніна зрабілі ўплыў выбуху бомбы, што палітыка, якая праводзілася партыяй да прыезду Леніна, нічога агульнага з гэтымі тэзісамі ня мела, што тэзісы азначалі для самога Леніна і для ўсёй партыі перавузбраеньне.

Як справа абстаяла ў сапраўднасьці?

Лютаўская рэвалюцыя перамагла ў Петраградзе і ва ўсёй краіне як паўстаньне рабочых і салдацкіх мас супроць царызму і супроць імпэрыялістычнай вайны. Гэта была перамога рабочых, авангардам якіх зьяўлялася бальшавіцкая партыя. На працягу многіх год, у самыя цяжкія гады рэакцыі, потым у гады рэвалюцыйнага ўздыму і, нарэшце, у гады сусьветнай імпэрыялістычнай вайны, імя **бальшавіцкая партыя,** наперакор ліквідатарам і трацкістам, якія прапаведвалі «ўпаўзаньне» ў стальшынскую легальнасьць, уровеньне рэвалюцыйных патрабаваньняў, падмену іх «свабодай коаліцыі» і г. д., бязупынна і сыстэматычна клікала рабочых па рэвалюцыйную барацьбу з царызмам, **за дэмакратычную рэспубліку, за 8-гадзінны рабочы дзень, за канфіскацыю памешчыцкіх зямель,** маючы на ўвазе ў далейшым **перарастаньне рэвалюцыі з дэмакратычнай у сацыялістычную.** У часе вайны, наперакор абаронцам, якія прапаведвалі падтрыманьне імпэрыялістычнай вайны, наперакор цэнтрыстам тыпу Мартава - Троцкага, якія ня скуміліся на гучную фразу, але і ўтрымлівалі масы на справе ад барацьбы з вайной, бальшавіцкая партыя заклікала масы **да ператварэньня імпэрыялістычнай вайны ў грамадзянскую,** вяла работу ў казарме, заклікала салдат шкіраваць сваю зброю супроць царызму.

І лютаўская перамога рабочых — рэвалюцыйнае зьвяржэньне царызму, пераход войск на бок народу, які змагаецца — было бліскучай перамогай бальшавізму.

Фальсыфікатары гісторыі Лютаўскай рэвалюцыі ў выгаду трацкізму (ад іх-жа першы ёсьць Шляпнікаў) дагаварыліся да такіх жудасных рэчаў, як адмаўленьне гегемоніі пралетарыяту ў гэтай рэвалюцыі.

А між тым, **Ленін** яшчэ ў 1911 годзе пісаў:

«Сваёй гераічнай барацьбой на працягу трох год (1905-1907 г. г.) расійскі пралетарыят заваяваў сабе і рускаму народу тое, на заваяваньне чаго іншыя народы патрацілі дзесяцігодзьдзі. Ён заваяваў вызваленьне рабочых мас з-пад уплыву аградніцкага і ганебнага лібералізму, ён заваяваў сабе ролю гегемона ў барацьбе за свабоду, за дэмакратыю, як умову для барацьбы за сацыялізм. Ён заваяваў усім прыгнечаным і эксплёатаваным масам Расіі ўменьне весьці рэвалюцыйную масавую барацьбу, без якой нідзе на сьвеце не дасягалася нічога сур'ёзнага ў прагрэсе чалавецтва.

Гэтых заваяваньняў не адніме ў расійскага пралетарыяту ніякая рэакцыя, ніякая нанавісьць, ляпіка і злосьць лібералаў, ніякія хістаньні, блізарукасьць і маляўнер'е сацыялістычных апартуністаў».

Тады-ж Ленін характарызаваў формулу адмаўленьня ад гегемоніі, як формулу «поўнага рэнэгацтва». Да гэтага поўнага рэнэгацтва і скаціўся Шляпнікаў, адмаўляючы гегемонію пралетарыяту ў лютым.

Пра **Лютаўскую рэвалюцыю** Ленін пісаў проста як аб перамозе рабочай класы.

«Рэвалюцыйны пралетарыят ня можа таму разглядаць рэвалюцыю інакш, як сваю першую, далёка яшчэ няпоўную перамогу на сваім вялікім шляху, ня можа ня ставіць сабе задачы працягнуць барацьбу за заваяваньне дэмакратычнай рэспублікі і сацыялізму...»

«Піцерскія рабочыя самааддана змагаліся супроць царскай манархіі, за свабоду, за зямлю для сялян, за мір, супроць імпэрыялістычнай бойні...»

«Рускім рабочым выпаў на долю гонар і шчасьце першым пачаць рэвалюцыю, г. зн. вялікую адзіна законную вайну прыгнечаных супроць прыгнечальнікаў. Пецярбурскія рабочыя перамагчы царскую манархію. У гераічнай барацьбе супроць паліцыі і царскіх войск, пачаўшы няўзброенымі паўстаньне супроць кулачэтаў, рабочыя прыцягнулі на свой бок вялікую частку салдат пецярбурскага гарнізона. Тое-ж адбылося у Маскве і ў іншых гарадох. Пакінуты сваімі вайскамі, цар павінен быў здацца».

І, нарэшце, як паказваў Ленін ролю **бальшавіцкай партыі** ў лютаўскія дні.

«Наша партыя аказалася з масамі, з рэвалюцыйным пралетарыятам, ня глядзячы на арышты і высылку ў Сібір нашых у 1914 годзе нашых дэпутатаў, ня глядзячы на надзвычайныя пра сьледаньні і арышты, якім у часе вайны падпадаў пецярбурскі камітэт за сваю нелегальную работу ў часе вайны супроць вайны і супроць царызму.

Факт кіраўніцтва, або, прынамсі, самаддаванай дапамогі пецярбурскім рабочым у вялікія дні рэвалюцыі павінен быў прызнаць сам ангельскі гучковец».

Чаму, ня глядзячы на гегемонію пралетарыяту ў барацьбе, на вялізарную ролю партыі — авангарда пралетарыяту, у нас устанавілася ў лютым ня ўлада саветаў, а ўлада буржуазнага часовага ўраду, фактычна зьвёх-уладзьдзе: спалучэньне імпэрыялістычнай дыктатуры буржуазіі і рэвалюцыйна-дэмакратычнай дыктатуры рабочых і сялян? Ленін дае адказ і на гэта пытаньне.

«Дзякуючы вялізарнай хуткасьці перавароту, дзякуючы простай дапамозе ангельска-францускіх імпэрыялістаў, дзякуючы недастатковай сьвядомасьці **усёй** (падкрэслена Леніным — **Н. П.**) рабочай і народнай масы, дзякуючы арганізаванасьці і падрыхтаванасьці расійскіх памешчыкаў і капіталістаў, яны захапілі ўладу ў свае рукі».

Што датычыць партыі, дык выйшаўшы з падполья пасьля лютага тэрору і прасьледваньняў, яна не магла адразу ахапіць сваім непасрэдным кіруючым уплывам вялізарныя масы, уцягнутыя ў рух. Адна перад тварам ўсяго блёку буржуазных і абаронных партый, маючых у сваім распараджэньні вялізарныя сродкі ўзьдзейнасьці на масы, частка якіх упяршыню пачынала сьвядомае палітычнае жыцьцё, партыя не магла адразу атрымаць большасьці ў саветах, асабліва бяручы пад увагу зьмешчаныя нормы прадстаўніцтва рабочых у параўнаньні з салдатамі. Але, апынуўшыся перад новымі задачамі, на новым стратэгічным этапе сваёй барацьбы, партыя пры ўсёй складанасьці абстаноўкі правільна вызначала шлях.

Партыя ўмацніла, скарыстоўваючы ўсе заваяваньні легальныя магчымасьці, сваю **непрымірымую барацьбу супроць вайны** і супроць захопніцкіх плянаў імпэрыялістычнай буржуазіі, на па зыцыі якой стаяў часовы ўрад. У першыя-ж дні рэвалюцыі па старонках «Правды» быў выкінут лёзунг **братаньня на фронце і ўзбраеньня рабочых.** У першыя-ж дні пасьля зьвяржэньня царызму рэвалюцыі **Бюро ЦК** расцэньвала часовы ўрад, як удар контр-рэвалюцыйнай буржуазіі.

Вялізарная большасьць партыі была супроць якога-б там ні было падтрыманьня часовага ўраду. Зьмешчаная ў нумары «Правды» ад 26 сакавіка рэзалюцыя **Бюро ЦК** ужо проста гаварыць аб тым, што цэнтрам згуртаваньня мас «павінны зьявіцца саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў у гарадох, саветы сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў у вёсках, як зачаткі дзяржаўнай улады, гатовыя ў далейшым працэсе ў пэўны момант разьвіцьця рэвалюцыі ажыцьцявіць паўнату ўлады пралетарыяту ў саюзе з рэвалюцыйнай дэмакратыяй для правядзеньня ў жыцьцё поўнасьцю патрабаваньняў паўстаўшага народу». А яшчэ ў нумары «Правды» ад 14 сакавіка тав. **Сталін** пісаў: «Умацаваць... саветы, зрабіць іх паўсяместымі, зьвязаць іх паміж сабой на чале з Цэнтральным саветам рабочых і салдацкіх дэпутатаў, як органам рэвалюцыйнай улады народу, — вось у якім напрамку павінны працаваць рэвалюцыйныя сацыял-дэмакраты». З самага пачатку партыя рашуча адкідала **якія-б там ні было** ўступкі абаронцтву і аб'яднаньне з абаронцамі, захоўваючы поўную ідэйную і палітычную самастойнасьць і супроць-стаўляючы сябе ўсяму буржуазна-абарончаму лягеру.

Нязвычайная складанасьць абстаноўкі давала сябе адчуваць. «Гэта быў найвялікшы пералом у гісторыі Расіі і нябывалы паварот у гісторыі нашай партыі», — адзначае тав. Сталін. «Старая дарэвалюцыйная плятформа простага зьвяржэньня самаўладзьтва была ясная і пэўная, але яна ўжо не падыходзіла да новых умоў барацьбы. Цяпер ужо нельга было ісьці на простае зьвяржэньне ўраду, бо ён быў зьвязан з саветамі, якія знаходзіліся пад уплывам абаронцаў, і партыі прыйшлося-б весьці вайну і супроць ураду і супроць саветаў. Але нельга было таксама весьці палітыку падтрыманьня часовага ўраду, бо ён зьяўляўся ўрадам імпэрыялізму. Неабходна была новая арыентыроўка партыі ў новых умовах барацьбы».

Складанасьць абстаноўкі, з аднаго боку, вялізарны рост актыўнасьці буржуазіі і асабліва дробнай буржуазіі, якая ўплывала на пралетарыят і на паасобныя праслойкі нашай партыі, з другога, зварот у партыю некаторай часткі адышоўшых ад яе ў гады рэакцыі і тым самым паказаўшых сваю невыстарчальную палітычную ўстойлівасьць элемэнтаў, нарэшце, прыход у арганізацыю многіх тысяч палітычна неспакушаных рабочых — усё гэта разам узятае спрыяла некаторай актывізацыі апартуністаў у паасобных праслойках партыі. Найбольш яркім праяўленьнем гэтай актывізацыі было афарбленьне на сакавіцкай партыйнай парадзе групы Вайцінскага-Сеўрука, якая па карэнным пытаньні рэвалюцыі — аб адносінах да вайны — цалкам скацілася на меншавіцкую пазыцыю і наперакор пастановам партыйнай парады галасавала па савецкай парадзе за абаронную рэвалюцыю Пэротэлі. Група Вайцінскага-Сеўрука была выключана з партыі і прагнана з сакавіцкай парады, дзе яна складала невялікую меншасьць, не зьвязаную з мясцовымі партарганізацыямі.

Моцна давалі сябе адчуваць апартуністычныя тэндэнцыі ў Каменева. Тав. Сталін у заключай прамове па сваім дакладзе аб сацыял

Поўнасьцю рэалізаваць пастановы партыі аб гарадзкой гаспадарцы

Менск павінен стаць узорнай чырвонай сталіцай

20 мільёнаў рублёў, асыгнаваныя на камунальнае і жыльлёвае будаўніцтва, расходваць з максымальнай эфэктыўнасьцю

Людзі, якія пасьля голду, або двугадовага перапынку вярнуліся ў Менск, не пазнаюць чырвонай сталіцы Савецкай Беларусі. Кожнае лета пакідае на вуліцах і кварталах горада незгладныя сьляды. Новыя шматпавярховыя і прыгожыя дамы вытясьняюць пустыры і пачыліны, вуліцы абнаўляюцца, абгранічваюцца ў брукаванку і клінкер, пашыраецца электрычнае асьвятленьне. Колькасьць трамваяў, аўтобусаў, аўтамабіляў расьце, праўда, невыстарчальна хутка, але ўсё-ж прыкметна. А ці даўно гэта было, калі па галоўных вуліцах стаяўцы ціха цытуявася конка, брынчачы і пасьпяваючы, як старыя калёсы? Усяго якіх-небудзь **два з паловай гады!** Зараз трамвайныя лініі і аўтахіцтыя вагоны ўжо не задавальняюць узрастаючых запатрабаваньняў пралетарскага насельніцтва. У гэтым годзе будуць пракладзены новыя лініі, колькасьць вагонаў значна павялічыцца, ужо па вуліцах сьвішчаць «дваццаткі» — моторныя вагоны з прычэпамі.

Кварталы Савецкай вуліцы ад Ленінскай да Камсамольскай дае прыблізнае ўяўленьне, якім будзе горад у бліжэйшыя гады. Мы гаворым, — прыблізнае таму, што гэты квартал пацягнуў толькі пад некаторыя абнаўленьні, у той час, як рад іншых вуліц будзе ў гэтым годзе карэнным чынам рэканструявана.

Будуюцца новыя шматкватэрныя дамы, рабочыя пасёлкі, дамы для спэцыялістаў. Палепшаецца матэрыяльнае, культурнае і бытавое становішча рабочых. Горад абагачаецца фабрычнай кухняй, новымі лазьнямі, пральнямі, гарадзкімі, паркамі культуры і адпачынку, скверамі і г. д.

На новае жыльлёвае будаўніцтва і дабрабыт Менску будзе затрачана ў гэтым годзе **звыш 20 мільёнаў рублёў**, што амаль **у 4 разы** перавышае мінулагодняя ўкладаньні (5.798 тыс. руб.). Адпавядаючая пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 12 кастрычніка 1931 году. На аснове гэтай пастановы складзены пляны жыльлёвага і камунальнага будаўніцтва ў Менску на 1932 год.

Задача заключаецца ў тым, каб дабіцца **поўнага выкананьня вызначаных плянаў**, з максымальнай эфэктыўнасьцю скарыстаць асыгнаваныя сродкі. **«Будаваць танна, хутка, добра, задавальняючы патрэбы працоўных! Поўнасьцю выканаць плян рабочага жыльлёвага будаўніцтва і праграму пабудовы дамоў для спэцыялістаў! За бальшавіцкае абслугоўваньне рабочых і спэцыялістаў, за дзесяткі тысяч новых дамоў, культурных баракаў, за іх дабрабыт, за гаспадарчую ўвагу да старых дамоў, за чыстату, за зелень, за выгады, за бальшавіцкую рэалізацыю пастановы чэрвеньскага пленуму нашай партыі!» («ПРАВДА»).**

***

На пасяджэньні камісіі садзейнасьці камунальнаму будаўніцтву, створанай пры «Зьвязьдзе», быў заслуханы даклад загадчыка кампасам тав. **Пінкасіка**. Выказаліся т. т. **Лепін** (Белжылсаюз), **Сталяроў** (Менбуд), **Станкевіч** (Вадаканал), **Каган** (работы будканторы камгасу), **Мітальман** (цэх прыўзных труб заводу імя Молатава), **Пятровіч** (Дзяржплян), **Клейн** (НКФ) і іншыя.

2.000 кватэр---у жыльлёвы фонд гораду

Жыльбудаўніцтва ў гэтым годзе атрымлівае надзвычайны размах. Па лініі камітэту гарсавету асыгнавана на гэту справу 3.679.900 руб., па лініі ўстановаў і жактаў — 3.839.200 руб. На 19 камунітах будуць пабудаваны пакоі, што дасьць 206 кватэр. Грунтаўні і Пяросьмінскі работы пасёлкі пачынаецца на 57 двухпавярховых дамоў палегчанага тыпу з 456 кватэрамі. Жыльлёвая кааперацыя пачне 112-кватэрны дом, будуе яшчэ 81 дом — усяго на 809 кватэр. Акрамя таго, будуць пабудаваны два дамы для ІТР і адзін дом для пісьменьнікаў.

За адзін год Менск павялічыць свой жыльлёвы фонд больш, як на 2.000 кватэр!

Будаўніцтва ўжо разгортваецца, але пакуль што вельмі марудна. Завод па выпуску стандартных дамоў яшчэ ня скончан. Для нармальнай работы заводу не хапае цэглы. Між тым **сьвячэньне** заводу дасьць яму магчымасьць выпускаць **па адным стандартным доме штодзенна.**

У пасёлку «Камінтэрн» дзесьць 8-кватэрных дамоў ня маюць печак, бо не хапае цэглы. Цэглу можна бязумоўна здабыць пры ўмове сапраўднай энэргічнай работе арганізацыі Кепска з вашай. Дастаўленая з Украіны ванна абыйшлася ў 110 руб. тона, замест лімітных 36 руб. і аказалася нізкай якасьці.

> **„У барацьбе за пяцігодку, за далейшыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, за посьпехі сацыялістычных прадпрыемстваў, за паляпшэньне матар'яльна - бытавых умоў рабочых, за культурны ўздым і ахову іх здароўя, за няўхільны рост рэальнай заработнай платы--пытаньні гарадзкой гаспадаркі (кватэра, водазабесьпячэньне, асьвятленьне, ацяпленьне, каналізацыя, гарадзкі транспарт, знадворны добрабыт, лазьні, пральні, грамадзкае харчаваньне) набываюць буйнейшае значэньне“. (З рэзалюцыі чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б).**

У гэтым годзе пачынаецца пабудова **пяцімаярховай гасьцініцы на 300 нумароў, коштам каля 2 млн. руб.** Будуць адрамантаваны ўсе іншыя гасьцініцы, заселены дом. Жыхары з гасьцініцы будуць перасяленыя ў стан партыяны і іншыя дамы. **На дзьве лазьні і пральню асыгнаван 1.464.000 руб.**

Забясьпечыць Вадаканал трубамі

На водаправодныя і каналізацыйныя работы асыгнавана зьыш 3 млн. руб. Будзе скончан будынак помпавай станцыі, пабудаваны жалеза - бетонны рэзэрвуар умяшчальнасьцю ў 50.000 вёдзер вады, пачнецца помпавай станцыяй і сальцовай сеткай пракладзен водаправод, разгорнуцца буйныя работы па каналізацыі і г. д. Асобнае «вузкае месца» на гэтым шляху— **адсутнасьць дрэўляных і керамічных труб і чыгунных фасонных частак.** Цэх дрэўляных труб заводу імя Молатава можа выпускаць штогодзіна 200 мэтраў пенарыўных труб і столькі-ж зьвяньняў, але цэх не забясьпечан дротам і жалезам. Будаўнічыя арганізацыі прасілі гэта пытаньне, не паслаўшы запрас у Наркамлес. Яшчэ горш з кераміч**ным трубамі, хоць ёсьць усе магчымасьці арганізаваць іх выраб у шырокім маштабе на Копысскім кахляным заводзе.** Да апошняга часу Копысскі завод выробляў такія трубы «шапошна», зьвыш сямёй прапрацы. **Але аб'яднаньне будматар'ялаў,** пасьля заняцьця тав. Станкевіча, пасьпяшна адносіцца да забясьпячэньня гарагоў БССР трубамі. Таму іх прыходзіцца закупаць у Барэнічах, пад Ленінградам. Такое-ж істаўленьне з фасоннымі частамі. **Менскія заводы адмаўляюцца ад заказаў Вадаканалу.** Раней адпраўлялася арсутнасьцю чыгунку. Атрымаў вагон чыгуну, а справа — ні з месца.

—Менскім заводам варта павучыцца ў ленінградзкіх,— гаворыць тав. Станкевіч,— **якія ўзялі шэфства над менскай ЦЭЦ і дапамагаюць яе будаваць...**

Наогул каналізацыйнымі работамі мала хто цікавіцца. Асаблівага тэта датычыць нарсамату лёгкай прамысловасьці, жактаў і інш.

Новыя трамвайныя лініі

Пачаліся ўжо работы па пракладцы трамвайнай лініі на Лахаўку. Канчаецца пракладка другой лініі да вытаўкі. Для абароны ад дроннага нападу'р'я ў асноўных пунктах чаканьня трамваяў будуць пабудаваны 4 пазыцыі. На папярэдняе трамваю асыгнавана **больш 1,5 млн. руб.** Пакуль што не хапае каля 2 клм. рэек. Новыя вагоны пачалі ўжо прыбываць. **Парк павялічыцца ў два разы.** Есьць надзея атрымаць некалькі грузовых плятформ і электровоз.

На аўтатранспарт асыгнавана 950.000 руб., на гужтранспарт — 226.600 руб.

З пытаньнямі транспарту цесна ўвязана **становішча вуліц.** Да апошняга году вуліцы адзавалася невыстарчальная ўвага. У гэтым годзе на забрукаваньне і перабрукаваньне вуліц асыгнавана **звыш 3,5 млн. руб.** Новага булыжнага бруку будзе пракладзена 75.000 кв. мэтраў, перабрукавана **столькі-ж.** Клінкер пакрые 18.000 кв. мэтраў вуліц, брынчатка — 6.000, асфальт — 9.000 кв. мэтраў.

Тратуары таксама спрацуцца ў новую попратку: 5.000 кв. мэтраў — у асфальт, 2.000 кв. мэтраў — у плітні.

Але выкананьне гэтага грандыёзнага плану моха аказацца пад пагрозай: з патрэбных 35.000 кбм. каменьня загатоўлена толькі 4.800 кбм. **12.000 кбм. каменьня павінен быў даць Заслаўскі раён,** але даў толькі 1.300. Ідуць спрэчкі з-за права вывозіць адтуль каменьні. Рабіны «катрыўты» прыкацць пад вокамі запасы каменьня, як Плошчэ пад «вартыкай пазеры. Брынчатка ўвозіцца з Украіны: патрэбна 2.000 тон, ёсьць 400. Асфальту патрэбна 30 вагонаў, ёсьць 18. Кепска з плітками для тратуароў.

Брукаваньне вуліц могуць затрымаць падземныя работы. Да гэтага часу невядома дакладна, дзе яны будуць праводзіцца. Ні адна арганізацыя не паведамілі, дзе яна думае капаць.

НА ЗДЫМКАХ: зьверху —новыя трамвайныя вагоны на вуліцах Менску; унізе—з недалёкага мінулага: 4 кані „цягнуць“ конку па вуліцы Бакуніна.

Больш зелені!

Пачата пабудова купальні (для Татарскага маста) з пропускной здольнасьцю ў 40 чалавек у гадзіну. **15 мая яна павінна быць гатова.** Пачаты работы ў парку культуры і адпачынку (па Барысаўскім тракце). Праўда, няма яшчэ праектаў памяшканьняў, пляжкаў, ня вызначаны тэрміны аканчаньня работ.

Паводле плану, треба пасадзіць у гэтым годзе па вуліцах Менску 6.000 дрэў. Садоўніцтва высунула суспрэчны плян у **10.000 дрэў.**

Значную ўвагу ў плане камунальнага будаўніцтва зайсадоць пытаньні электразабесьпячэньня. Эльводу асыгнавана звыш паўмільёна рублёў на папярэдняе. Будзе пушчан кацёл № 5, пераабсталяваны топкі пад фрэзэрны торф, па вуліцах будзе ўстаноўлена яшчэ 200-300 ліхтароў.

ЦЭЦ—у цэнтр увагі

Вялікая задача стаіць перад менскімі арганізацыямі ў справе пасяджэньня будаўніцтва ЦЭЦ. **Трэба, як мага хутчэй, прыступіць да выкананьня катлавану.** Пакуль што заканчываецца пабудова чыгуначнай веткі і стаяўкі. Треба вывазіць чыгуноўку ад розных пабудоў. Треба па-бальшавіцку ўзяцца за выкананьне пытаньня аб апалавай базе і пачаць у патрэбным маштабе **падрыхтоўку балот.**

Вось, вельмі коратка, аб асноўных работах па дабрабыце і камунальным будаўніцтве гор. Менску.

***

Плян вялікі і складаны. У сувязі з гэтым **адказнасьць гарадзкіх арганізацый перад партыяй, перад рабочым насельніцтвам гораду вельмі вялікая. Плян жыльлёвага і камунальнага будаўніцтва павінен быць выкананы ва што-б там ні стала.** Зусім анармальна, калі «становішча камунальнай гаспадаркі і добрабыту гор. Менску ацэнае ад шпарких тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва і вызначэньня з гэтым росту культурных і матар'яльных запатрабаваньняў працоўных мас» (з паст. СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 12 кастрычніка 1931 г).

Камісія садзейнасьці камунальнаму будаўніцтву вызначыла першыя неабходныя мерапрыемствы па разгортваньні работ:

1) паскорыць разьмеркаваньне нарадаў па матар'ялы па будаўнічых арганізацыях;

2) дабіцца вопыту проту і жалеза цэху дрэўляных труб заводу імя Молатава;

3) дабіцца вырашэньня пытаньня аб выпрацоўцы кераміч**ных труб** на копысным заводзе;

4) паскорыць адпуску чыгунных фасонных частак па мопоких маштабах будаўнічых заводах;

5) дабіцца ўзмацненьня дастаўкі каменьня, брынчаткі і клінкеру для брукаваньня вуліц;

6) забясьпечыць завод стандартных дамоў прыёмам і ўсім неабходным;

7) арганізаваць рэйд па прадпрыемствах для выяўленьня ўнутраных рэсурсаў у дапамогу камунальнаму будаўніцтву;

8) дапамагчы ЦЭЦ фарсаваць падрыхтоўчыя работы да пачатку будаўніцтва;

9) зьвярнуцца праз газэту «Вечерняя Москва» і харкаўскія газэты да работных «УКРМИНО» з просьбай паскорыць адпраўку брынчаткі для Менску;—

10) узмацніць абмен матар'ялмі праз газэту «Вечерняя Москва» па пераклічы чырвоных сталіц.

Мабілізаваць рабочыя масы ў дапамогу камунальнаму і жыльлёвазму будаўніцтву

Але зусім ясна, што сіламі адзай камісіі садзейнасьці на ўдасца забясьпечыць выкананьне плану камунальнага будаўніцтва. Асноўнай задачай камісіі зьяўляецца **мабілізацыя** —праз друк, масавыя рэйды, абсьледаваньні, пераклічкі і г. д. — **самых шырокіх мас будаўнікоў і рабочых прадпрыемстваў,** зьвязаных з **камунальным будаўніцтвам, на выкананьне плану будаўніцтва, мабілізацыя партыйных і прафсаюзных арганізацый і рабочай масы супроць тых, хто зрывае работу, хто перашкаджае цьвёрдаму выкананьню бальшавіцкага плану паляпшэньня культурна - бытавога становішча рабочага насельніцтва чырвонай сталіцы.**

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі ўсіх гарадзкіх прадпрыемстваў павінны **накіраваць ўшчыльнуцца ў барацьбу за выкананьне плянаў камунальнага і жыльлёвага будаўніцтва.**

Планы будаўніцтва павінны быць даведзены да **кожнага рабочага і служачага, да кожнага спэцыяліста, да кожнага члена сямьі.**

На кожным прадпрыемстве, у кожнай установе павінна быць пастаўлена і абмеркавана пытаньне аб той **практычнай дапамозе,** якую гэты калектыў можа аказаць гарадзкому будаўніцтву.

ДАПАМОГУ КАМУНАЛЬНАМУ І ЖЫЛЬЛЁВАМУ БУДАЎНІЦТВУ — НА РЭЙКІ САСПАБОРНІЦТВА І ЎДАР - НІЦТВА!

Рабочыя, работніцы, ударнікі, спэцыялісты, будаўнікі! Выступайце з **канкрэтнымі самаабавязацельствамі** ў дапамогу камунальнаму і жыльлёваму будаўніцтву, мабілізуйце сваю ініцыятыву і ўнутраныя рэсурсы сваіх прадпрыемстваў, бярэце шэфства над пасобнымі аб'ектамі пабудоў, дабівайцеся эканомнага і добраякаснага будаўніцтва, дабівайцеся дагэрміновага выкананьня будаўнічых пляноў.

ДАРОЖНАМУ БУДАЎНІЦТВУ— БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ

(Да ўсебеларускай партнарады па дарожным будаўніцтве)

Індустрыялізацыя краіны, аўтамабілізацыя яе, сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі з ўсёй рашучасьцю высоўваюць пытаньне аб барацьбе з бездарожжам.

XVII ўсесаюзная партканфэрэнцыя ў дырэктывах да складаньня 2-й пятгодкі прапанавала: **«Па дарожным і шасэйным будаўніцтве і аўтамабілізацыі забясьпечыць больш шпаркія тэмпы разьвіцьця, чым па іншых галінах транспарту».** Дарожнае будаўніцтва мае вялікае значэньне і ў справе ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны. Між тым, стан работ па дарожным будаўніцтве зусім незадавальняючы і сталіць пад пагрозу выкананьне пляну 1932 году.

На 16 красавіка плян выканан у наступных паказальніках: па загатоўцы і вывазцы каменю—на 20 %; гравія — 8 проц.; пяску — 6 проц., лесу — 30 проц.; земляныя работы прыверчены на 14 проц. На 5 красавіка плян загатоўкі шпалак выканан на 8 проц., бойкі пячбіню — 8 проц., і г. д.

Такое дрэннае выкананьне пляну ёсьць перш за ўсё вынік шкодніцтвачай бязьдзейнасьці групы зьменьніў самой сыстэмы дарожнага будаўніцтва.

Асобна арэтае механізацыя, аўтатранспарт і конны транспарт.

Плян механічнай бойкі пячбіня яе выкананы. Устаноўленыя кампрэсарабыкі перажываюць працуюць толькі ў адну зьмену і то са слабай нагрузкай. Прадукцыйнасьць эксцэвэтар устаноўленых 5,25 кбм. у гадзіну даўжэйшчыцца 3 кбм. Рад кампрэсарабікаў зусім не ўстаноўлены. Дрэнна падрыхтаваліся механізмы і да ўвагі. Рамонт патоўдзе марудным тэмпамі і пяцібранкасна.

На лепш і з аўтатранспартам. У большасьці аўтаатрадаў на ходу толькі палова пазўтага аўтапарку. Машыны, якія працуюць, таксама ня выконваюць сваіх норм перавозак. У аўтаатрадзе № 5, напрыклад, плян перавозкі пракуў выкананы толькі на 65 проц. Маюць месца зьявішча прастоі з прычыны дрэннай дарогі, з-за перабоўў у запраўцы і разгрузцы, з-за слабай працэўнай дысцыпліны сярод шофэраў, а таксама з прычыны частай аварыйнасьці. У аўтаатрадзе № 1 за час с 1 лютага. па 11 сакавіка на шыны былі ў ходзе 7.185 гадз., з прастою мелі — 8.357 гадз. У аўтаатрадзе № 3 машыны былі ў ходзе толькі 32 проц. карыснага часу.

Конскі транспарт дрэнна працуе. За выключэньнем незначнай часткі дзе работа пастаўлена больш-менш здавальняючага (13 і 41 конскія транспарты), у большасьці плыны перавозак коштранспарту сарваны. На работу выходзіць незначны процант коняй.

Галоўная прычына слабых тэмпаў выкананьня плянаў хаваецца ў вельмі старчальным упраўленьні ў дарожным будаўніцтве новых мэтодаў працы, слабай рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, у дрэнным культурна - бытавым абслугоўваньні рабочых. Няма патрэбнай колькасьці баракаў.

Невыкананьне плянаў вывазкі дар будматар'ялаў сьведчыць таксама аб пагарджэньні важнасьці гарознага будаўніцтва і з боку раду раённых арганізацый. Толькі незначная частка раёнаў (**Дрысенскі, Ельскі**) паказала ўзоры бальшавіцкай барацьбы за добрую дарогу. Зусім адсталі **Расонскі, Менскі, Лепельскі, Полацкі, Віцебскі, Бешанковіцкі і Асіпавіцкі** раёны.

Треба адзначыць, што па парушэньніцтве слаба разгорнута партыйная і прафсаюзная работа. У радзе месц партработа нагадзе, арганізацыйна не прыняла перабудавана.

Створаныя партгрупы яшчэ не паказалі сваёй работы. Слаба пастаўлена партыйна - выхаўчая і масавая работа. Партарганізатары вучастка яшчэ ня посьпелі зайсьвоіцца пекарод на перапрацоўкі. РК КП(б)Б у рэсце рэбіцеў ня кіруе партработай на дарожным будаўніцтве.

Задача першай усебеларускай нарадпаранды па дарожным будаўніцтве пры ЦК КП(б)Б, якая абвяшчае ваяцьвяцьцем —ліквідацыі трэвіі зімовай работы і вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы, якія забясьпечаць поўнае выкананьне пляну 1932 году.

І. Пэўзнэр.

АРГАНІЗАВАНА ПРАВЕСЬЦІ МАСАВЫ ВЫЕЗД КАЛГАСАЎ НА САВЕЦКІ РЫНАК

Лішкі таварнай прадукцыі ўключыць у арганізаваны таваразварот

Саўгасна - калгасны гандаль — магутны фактар у набілізацыі ўнутраных рэсурсаў для паляпшэньня рабочага снабжэньня, важны стымул для арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Гэтага яшчэ не разумеюць некаторыя арганізацыі і работнікі.

Напрыклад паводле думкі работніка віцебскага гарсавету тав. **Залескага** «няма чаго адкрываць магазыны, бо няма чым гандляваць», а адказны работнік бабруйскага зэкадпрэлу **Шаціла** лічыць, што калгасны гандаль — «дробная справа». Між тым, ва многіх калгасах гэтых-жа раёнаў ёсьць дзесяткі тон лішкаў прадукцыі, асабліва гародніны, што засталіся пасьля выкананьня плянаў здачы таварнай прадукцыі дзяржаве.

Аб тым, як некаторыя прафсаюзныя арганізацыі адносяцца да гэтай важнай справы сьведчыць той факт, што праф арганізацыі Менску не знайшлі нават патрэбным ня гледзячы на запрашэньне, прысылаць свайго прадстаўніка на нараду ў Калгасцэнтр.

Будаўніцтва савецкіх рынкаў зацягваецца. Гарсаветы, гарспабы не праяўляюць зацікаўленасьці. Замест 27 рынкаў на 330 ларкоў, па БССР адкрыта пакуль толькі 9 рынкаў на 150 ларкоў.

Эканомсавет абавязаў Белкаапсаюз безадкладна скончыць будаўніцтва савецкіх рынкаў, прычым ня менш 50 месц на рынку павінна быць адведзена для саўгасна-калгаснага гандлю. Апрача таго, гарсаветы павінны вызначыць месцы для продажу з вазоў.

Гэта дырэктыва Эканомсавету павінна быць рэалізавана ў найкарацейшы тэрмін.

У Віцебску найбольш буйныя прадпрыемствы «Чырвоны мэталіст», пашыўная і акулярная фабрыкі абавязаліся дапамагчы калгасам адкрыць магазыны і ларкі пры фабрыках. Да 20 красавіка калгас імя Молатава адкрывае магазын пры заводзе «Чырвоны мэталіст».

У Полацку ініцыятыву прапаў ЦРК лі ў час выезду калгасаў і калгаснікаў на рынак, арганізуе на рынку гандаль прамтаварамі. Гэта мерапрыемства поўнасьцю сябе апраўдала.

Першыя ўзорныя масавыя выезды калгасаў і калгаснікаў на савецкія рынкі ў Менску, Віцебску, Гомелі, Барысаве і Слуцку адбудуцца 24 красавіка.

Напярэдадні ва ўсіх паказаных раёнах склікаюцца інструкцыйныя нарады старшынь калгасаў.

Посьпех першага масавага выезду павінен быць забясьпечан шляхам правядзеньня шырокай растлумачальна-масавай работы сярод калгаснікаў, пры актыўнай дапамозе з боку ўсёй пралетарскай грамадзкасьці. М. К.

„У прынцыпе згодны“

БАБРУЙСК. (Наш кар.).

Райкалгассаюз у прынцыпе згодзен з неабходнасьцю разгортваньня калгаснага гандлю. Але на справе атрымліваецца зусім адваротнае.

З красавіка праўленьне райкалгассаюзу пастанавіла прыкацаваць калгасы да паасобных ЗРК. Але гэта было праведзена габінэтным парадкам. ЗРК прадпрыемствай і, у прыватнасьці, швэйнай фабрыкі, заводаў імя Варашылава і Сталіна ня ведалі аб меркаваньнях райкалгассаюзу і ў гэтай галіне са свайго боку не правялі ніякай работы.

Намесьнік старшыні праўленьня райкалгассаюзу Ермалаеў лічыць, што «з вазоў гандляваць нязручна, а ў крамах няма месца для калгаснай прадукцыі». У сапраўднасьці-ж многія крамы фактычна пустуюць.

Земадзел РВК лічыць саўгасна - калгасны гандаль «дробнай справай». У земадзеле гавораць: «наш аддзел —не гандлёвы, а таму мы ня можам займацца дробязямі».

Бабруйскі раён мае ўсе магчымасьці разгарнуць калгасны гандаль. Ва многіх калгасах, саўгасах, Мышкаўскага, Харлапавіцкага, Паўлаўскага сельсаветаў ёсьць лішкі гародніны і інш. прадукцыі. С. З.

АБ ВЫРАБЕ ДРАЎЛЯНЫХ ТРУБ І ЖАЛЕЗНЫХ ЧАСТАК ДА ІХ

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

Выслухаўшы паведамленьне прадстаўніка НК РСІ тав. АРНДТА аб невыкананьні пастановы Эканамічнага Савету БССР за 28 ліпеня 1931 г. «Аб арганізацыі вырабу драўляных труб на дрэваапрацоўчых заводах БССР» (прат. № 15 п. 20) і тлумачэньні прадстаўнікоў трэсту Белдрэў тав. СТАДОЛЬНІКА і Белмэталяб'яднаньня т. ЛЕВІНА, Камісія выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Лічыць устаноўленым, што трэстам Белдрэў і Белмэталяб'яднаньнем амаль што сарвана справа арганізацыі вырабу на заводах БССР драўляных труб і жалезных частак да іх для патрэб камунальнай гаспадаркі, што можна ацаніць, як сьведомы зрыў ажыцьцяўленьня гэтай важнейшай справы.

2. Абавязаць асабіста дырэктара трэсту Белдрэў т. БЕРГІСА праз 5-10 дзён накладзіць масавы выпуск драўляных труб і спэцыяльнай дакладной запіскай паведаміць Камісіі выкананьня аб выкананьні гэтага даручэньня.

3. Даручыць упаўнаважанаму Народнага Камісарыяту цяжкай прамысловасьці СССР пры СНК БССР тав. АМБРАЖУНАСУ, пад яго персональную адказнасьць, на працягу 3-х дзён арганізаваць поўным ходам выраб фасонных частак і ўмацаваньняў для драўляных труб і аб выкананьні гэтага даручэньня праз 5 дзён паведаміць Камісіі выкананьня.

4. Папярэдзіць т. АМБРАЖУНАСА, БЕРГІСА І САКАЛЕНКА (Белмэталяб'яднаньне), што ніякія адгаворкі аб тым, што няма сырцу, або аб тым, што немагчыма наладзіць выраб драўляных труб, прымацца пад увагу ня будуць і асобы, якія будуць супраціўляцца ажыцьцяўленьню гэтага мерапрыемства, будуць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

5. Адзначыць, што Вадаканалтраст нічога не зрабіў для таго, каб рэалізаваць пастановы ЭКАСА за 28 ліпеня 1931 г. і СНК і ЦК КП(б)Б ад 3-га кастрычніка 1931 г. аб нападжаньні вырабу драўляных труб і скарыстаньня іх для паляпшэньня дабрабыту гарадоў, тым самым паказаў сваю незацікаўленасьць у справе паляпшэньня становішча рабочай клясы. Адначасова адзначыць, што і Народны Камісарыят Камунальнай Гаспадаркі, як зацікаўленая установа, не праявіў патрэбнай настойлівасьці ў наладжаньні вырабу драўляных труб.

6. Даручыць персональна народнаму камісару камунальнай гаспадаркі тав. АКСІОЧЫЦУ і дырэктару Вадаканэтрасту т. СТАНКЕВІЧУ праз 2 дні даць Белдрэву і Лесаснабзбыту свае заяўкі і спэцыфікацыю драўляных труб і спэцыяльнай тэлефонаграмай паведаміць Камісіі выкананьня аб выкананьні гэтага даручэньня.

7. Давесьці да ведама ЦК і ЦКК КП(б)Б аб зрыве вырабу драўляных труб і прасіць ЦК і ЦКК КП(б)Б прыцягнуць да партыйнай адказнасьці тых асоб, якія зьяўляюцца адказнымі за гэту справу.

Старшыня Камісіі Выкананьня
М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар Камісіі Выкананьня
Я. ЭЛЬКІН.

УЗОР «ІНІЦЫЯТЫВЫ» МЕНСКАГА РАЙКАЛГАССАЮЗУ НА ЗДЫМКУ: Унутраны выгляд калгаснага магазыну у Менску. У сваіх загадчык магазыну Вайчюк, які нічога ня робіць, каб арганізаваць гандаль с.-г. прадуктамі і запруджвае паліцы вінными вырабамі.

вецкай дзяржаве, як аб форме пралетарскай дыктатуры.

Як адзначае тав. Сталін, партыя знаходзілася на поўдарозе. «Патрэбны былі вядомыя красавіцкія тэзісы Леніна для таго, каб партыя змагла адным узмахам выйсьці на новую дарогу». (Сталін, «На путях к Октябрю», стар. 8). Абсалютна ясна, што справа ішла аб паскарэньні ўжо пачатага рапей руху, а не аб пераўзбрасьні, не аб адмаўленьні ад старой пазыцыі і замене яе новай.

Партыя так лёгка і хутка прыняла ленінскія тэзісы, таму што гэта была ленінская партыя ўсёй сваёй папярэдняй гісторыі: пазыцыяй у часе рэвалюцыі 1905-1907 г.г., у гады рэакцыі і новага ўздыму, у гады сусьветнай імпэрыялістычнай вайны падрыхтаваная да таго, каб ад рэвалюцыі дэмакратычнай зараз-жа і якраз у меру нашых сіл перайсьці да **рэвалюцыі сацыялістычнай.**

Адсюль, зразумела, ня вынікае, што пасьля пазыцыяй Леніна ў 1905 г. і ў 1917 г. ня было ніякай розьніцы, як схільны думаць некаторыя таварышы, якія ў сваім вульгарызатарстве і спрашчэньне скочваюцца да адмаўленьня гісторыі бальшавізму. Як вядома, толькі ў 1915 г. Ленін упяршыню высунуў тэзіс аб магчымасьці перамогі сацыялізму ў адной краіне, даўшы разгорнуты аналіз імпэрыялізму. Толькі ў 1917 г., у прыватнасьці ў красавіцкіх тэзісах, Ленін высунуў праграму стварэньня дзяржавы савецкага тыпу, як вышэйшага тыпу парэўнальна з буржуазнай парляментарнай рэспублікай. Тав. Сталін піша з повазу гэтага: «Ленін ня ведаў яшчэ ў 1915 годзе савецкай улады, як дзяржаўнай формы дыктатуры пралетарыяту. Ленін ведаў яшчэ ў 1905 годзе, што паасобныя саветы зьяўляюцца зачаткам рэвалюцыйнай улады ў перыяд зьвяржэньня царызму. Але аб'ягнаную ў дзяржаўным маштабе савецкую ўладу як дзяржаўную форму дыктатуры пралетарыяту ён яшчэ ня ведаў тады. Рэспубліку саветаў, як дзяржаўную форму дыктатуры пралетарыяту, Ленін адкрыў толькі ў 1917 годзе» (**Сталін, «Аб апазыцыі»**, стар. 520).

Партыя ў сваёй пераважнай большасьці быстра і лёгка стала на пазыцыі красавіцкіх тэзісаў таму, што была падрыхтавана да гэтага ўсёй сваёй папярэдняй гісторыяй і **сваёй пазыцыяй у лютаўска-сакавіцкі пэрыяд рэвалюцыі,** які папярэджваў прыезд Леніна. Толькі невялікая група на чале з тав. Каменевым прабавала пачаць прынцыповую барацьбу супроць ленінскіх тэзісаў і адразу-ж апынулася ў ізольнай ізаляцыі. Заметка Каменева і яго невялікі падвал — вось усё, што зьявілася на старонках «Правды» супроць тэзісаў Леніна ў парадку дыскусіі перад красавіцкай канфэрэнцыяй. І на красавіцкай канфэрэнцыі, якая адкрылася менш чым праз тры дні пасьля агалашэньня тэзісаў, апартуністычная група Каменева, лічыўшая, што наша краіна не пасьпела для сацыялістычнай рэвалюцыі, што сацыялістычная рэвалюцыя можа пачацца толькі ў перадавых капіталістычных краінах, аказалася ў нікчэмнай меншасьці.

А на якой пазыцыі ў гэты час стаяў Троцкі? Гэта была пазыцыя гульні ў захват улады рабочай клясай, якая спалучалася з адмаўленьнем сацыялістычнага характару нашай рэвалюцыі. Разам з Каменевым Троцкі знаходзіў, што сацыялізм можа перамагчы ў адсталай Расіі толькі пры палучэньні дзяржаўна арганізаванай дапамогі эўрапэйскага пралетарыяту, ужо зрабіўшага пераварот. Троцкі пераскокваў праз сялянства, лічачы пралетарыят па сутнасьці адзінай рухаючай сілай рэвалюцыі, і ў той-жа час меркаваў, што ўзяўшы ўладу ў свае рукі пралетарыят ня зможа разгарнуць колькі-небудзь сур'ёзных сацыялістычных мерапрыемстваў і будзе наўзычай хутка скінут, калі не атрымае дапамогі дзяржаўна арганізаванага эўрапэйскага пралетарыяту.

Тав. Сталін ужо даўно паказаў, што «пераскокваньне» праз сялянства пры сваёй знадворнай левізне гэтага пераскокваньня было на справе ў Троцкага **адмаўленьнем здольнасьці пралетарыяту кіраваць сялянствам, адмаўленьнем гегемоніі пралетарыяту ў буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі і пры перарастаньні гэтай рэвалюцыі ў сацыялістычную.**

З адмаўленьнем сацыялістычнага характару нашай рэвалюцыі, з адмаўленьнем яе сацыялістычных пэрспэктыў — ажыцьцяўленьня дыктатуры пралетарыяту і пабудовы сацыялізму ў нашай краіне, з адмаўленьнем гегемоніі пралетарыяту ў рэвалюцыі ў Троцкага натуральна была зьвязана ярка пэйтрыцкая пазыцыя ў адносінах да вайны і да II Інтэрнацыяналу. Яна па сутнасьці супадала з пазыцыяй Мартава і Аксэльрода. І імянна таму, Ленін пры першых вестках аб лютаўскім перавароце пісаў: «Па-мойму, галоўнае зараз — ня даць слабе заблытаць у глупыя аб'яднальныя спробы з сацыял-патрыётамі (або яшчэ небясьпечней), якія хістаюцца пакуль-ці арганізацыйнага камітэту, Троцкага і К° і ня спыняць работу сваёй партыі ў пасьлядоўна інтэрнацыяналістычным духу». (т. XX, стар. 7).

Толькі праз тры з паловай месяцы пасьля красавіцкіх тэзісаў Троцкі быў прынят у бальшавіцкую партыю, для чаго яму самому (а не бальшавікам) прышлося даволі грунтоўна «пераўзброіцца», частку-ж свайго антыбальшавіцкага багажу часова схаваць у шафу. А далейшы шлях трацкізму — праз фракцыйную барацьбу з Леніным і ленінскім ЦК, побач з тымі, хто выступаў супроць красавіцкіх тэзісаў, супроць пераарастаньня рэвалюцыі і супроць кастрычніцкага паўстаньня — прывёў яго ў лягер буржуазнай контррэвалюцыі, зрабіў перадавым атрадам гэтай контр-рэвалюцыі.

Красавіцкія тэзісы сапраўды ў свой час зрабілі ўражаньне выбуху бомбы, але не па партыю, а па буржуазію і меншавікоў. Плеханаў назваў іх «брэдам». «Брэдавымі» паказаліся буржуазіі і перашоўшым на яе бок «сацыялістам» лёзунг рэспублікі саветаў, як формы ажыцьцяўленьня пралетарскай дыктатуры; нацыяналізацыя банкаў, рабочы кантроль над вытворчасьцю і іншыя мерапрыемствы, якія расчышчалі шлях для сацыялістычнага будаўніцтва.

ППС ДАМАГАЕЦЦА НОВАЙ „ПАЦЫФІКАЦЫІ“ ЗАХ. УКРАІНЫ

«Пацыфікацыя» Заходняй Украіны, як відома, не зламала гераічнай нацыянальна - вызваленчай барацьбы украінскіх рабоча-сялянскіх мас. Пацыфікатарам не ўдалося затапіць у крыві тэй нянавісьці, якою палалі рабочыя і сяляне Заходняй Украіны да акупантаў.

Новы ўздым барацьбы з акупантамі, новы выбух нянавісьці—быў лепшым адказам заходнія-украінскіх працоўных мас на крывавую расправу, нісканальным увасабленьнем гэтай нянавісьці быў замах і забойства Тарыша Галувкі. Невядомая рука, якая трымала ў нагнітаецелі «пацыфікацыі», выканала сацыяльны заказ нацыянага гневу.

Нядаўна тэлеграф прынёс вестку аб забойстве камісара палітычнай паліцыі ў Львове — дэфэнзыўнічыка Чэхоўскага. Надзвычай сымптоматычна, што акупантам не ўдалося выкрыць вінаватых ні аднаго, ні другога забойства.

Сымкротны выстрал, які прагрыў грудзі Голувкі, быў спатканы польскім сацыял - фашыстам зьмяхлым сьлезам. Нечага дабіўшага. ППС выгадавала Галувку, яна была калыскай гэтага ката падмяволеных народаў Польшчы, як і цэлага раду іншых «нітоў» фашысцкай дыктатуры.

І цяпер пасьля таго, як увесь дэфэнзыўны апарат акупантаў аказаўся бяссільным знайсьці хоць-бы сьлед вінаватых, — ППС пачынае дэмаскаваць і першая голасна выказвае сваё пераданьне.

У «Роботніку» № 127 за 14 красавіка чытаем:

«Лягер «санацыі» арганізаваў многа ўрачыстых вечароў і маніфэстацый для ўшанаванньня памяці Галувкі. Гэта вельмі прыгожа, але мы — людзі, з якімі Галувка вельмі (!) радыкальна (!!) разьвіўся ў астатнія гады свайго жыцьця, хацелі-б ведаць, ці сьледзтва прышло да якіх - небудзь рэзультатаў?

Ці можна сабе ўявіць, каб пасьля амаль васьмі месяцаў, улады, што вядуць сьледзтва, не натрапілі ні на адзін сьлед, ні на адно дапушчэньне адносна мэты крывіцы й арганізацыі сьмяротнага замаху?» (падкрэсьленьні «Роботнікам»).

Цэнтральны орган польскага сацыял - фашызму становіцца ў грозную позу. Ён пытае можа супакойцца: як гота ўлада яго моска вынырыць злачынцаў?! ППС захлынаецца ад злосьці.

Сьцьвярджаючы, што «забойства Галувкі было, бясумоўна, нейкім спэцыяльным фактам», сацыял - фашысцкі орган абгуртаецца, што «НЯЯКАЯ ХВАЛЯ ПАЛІТЫЧНАГА ТЭРОРУ (чытай: новай «пацыфікацыі») НЕ НАСТУПІЛА ПАСЬЛЯ ГЭТАГА ЗАБОЙСТВА».

Цынізм польскіх «сацыялістаў» ня мае прэцэдэнт. Выступаючы на словах супроць тэрору, супроць ваенна - паліцыйных судоў — ППС на справе падтрымлівае цалкам і поўнасьцю палітыку Пілсудзкага, зьяўляецца АПОРАЙ дыктатуры фашызму.

Тое, што ППС, як самы верны пёс, стаіць на варце інтарэсаў польскай дзяржаўнасьці, польскага імпэрыялізму, што ППС за самае рашучае вынішчэньне нацыянальна - вызвалеўчага руху на акупаваных Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі — не сьаўляецца ні для кого сакрэтам. Але апошняе выступленьне ЦО ППС заслугоўвае ўвагі. Тут сацыял - акупанты спатаніць яшчэ раз апошнюю спаду і, АДКРЫТА ДАМАГАЮЧЫСЯ НОВАЙ «ХВАЛІ ПАЛІТЫЧНАГА ТЭРОРУ», НОВАЙ «ПАЦЫФІКАЦЫІ» ЗАХОДНЯЯ УКРАІНЫ.

Новае мора крыві працоўных Заходняй Украіны, зьнішчэньне цэлых вёсак, культурна - асьветных украінскіх арганізацый, школ,—як кампэнсацыя за сьмерць Галувкі — вось ня на справе польскі сацыял-фашызм вырашае нацыянальнае пытаньне.

В. Т.

НА ЗДЫМКУ: ваенныя лягеры фашысцкай арганізацыі жанчын.

Цяга польскіх сялян у СССР

За апошні час наглядаюцца частыя выпадкі звароту польскіх сялян да савецкага консульства ў Варшаве з хадайніцтвам аб прыняцьці іх у грамадзянства СССР і аб перасяленьні ў Савецкі Саюз у мэтах арганізацыі калгасаў.

Гэтыя звароты набываюць масавы характар і выходзяць ужо не ад адзінак, а ад цэлых вёсак, якія жадаюць перасяліцца ў СССР і арганізаваць тут калгасы.

Так, напрыклад, у адным лютым 1932 году 176 сем'яў зьвярнуліся з хадайніцтвам аб перасяленьні іх з Польшчы ў СССР для вядзеньня калектыўнай гаспадаркі.

ПЛЯН сьвяткаваньня 1-га мая 1932 году ў гор. Менску

30 красавіка да 5 гадз. увечары ўсе дзяржаўныя, грамадзкія, прафэсыянальныя і каапэрацыйныя ўстановы і арганізацыі павінны ўпрыгожыць сьцягамі, плякатамі, лёзунгамі, партрэтамі правадыроў і ілюмінаваць занятыя імі памяшканьні.

30 красавіка, 1 і 2 мая па ўсіх куль турна - асьветных установах і прадпрыемствах праводзяцца масавыя вечары з удзелам чырвонаармейцаў, надшэфных часьцей і калгасьнікаў падшэфных калгасаў.

30 красавіка ўвечары ў рабочых цэнтрах (рог Савецкай і Лагойскага шляху, пасёлак Камінтэрн, рог Чырвонаармейскай і Першамайскай, рог Койданаўскага шляху і Барысаўскага завулку) арганізаваць лятучыя мітынгі і канцэрты сіламі Рабіса.

30 красавіка ўвечары а 9 гадз. 30 хв. арганізуецца факельная дэманстрацыя камсамолу на пляц Волі, па Ленінскай і Савецкай вул.

1 мая на пляцы Парыскай Камуны а 10 гадз. раніцы адбудзецца парад войск Менскага гарнізону і прыняцьце прысягі маладымі чырвонаармейцамі.

Удзел у прыёме параду прымаюць дэлегаты ад прафэсыянальных саюзаў, якія зьбіраюцца на пляцы Волі каля будынку гарсавету роўна а 9 гадз. і а 9 гадз. 15 хвілін накіроўваюцца на пляц Парыскай Камуны. Кожны прафэсыянальны саюз вылучае дэлегацыю з 25 асоб з ліку лепшых ударнікаў.

Войскі гарнізону па скапчэньні параду накіроўваюцца па вуліцах: Шырокай, Бакуніна, на пляц Волі, дзе праходзяць каля трыбуны на Ленінскую вуліцу і направа па Савецкай. Вылучаныя дэлегацыі ад прафсаюзаў па скапчэньні параду з пляцу Парыскай Камуны накіроўваюцца да сваіх калён.

1 мая ўсе рабочыя і служачыя прымаюць удзел ў агульна - гарадзкой дэманстрацыі, збор дэманстрантаў праводзіцца па клюбах, прадпрыемствах, установах, адкуль арганізаваным парадкам кожная калёна павінна ў 11 гадз. заняць вызначанае ёй па гэтым пляне месца ў агульнай калёне.

Кожная калёна павінна быць пастроена такім чынам, каб усе атрымаўшыя ўзнагароды чырвонаармейцы, чырвонагвардзейцы, партызаны і ўдарнікі былі ў першых радох сваёй калёны. Кожная калёна вызначае па 2 асобы, адна з якіх зьяўляецца кіраўніком калёны ўвесь час ідучы на чале яе, а другая прыбывае на пляц Волі і зьвязваецца з адказным за парадак і пабудову калён тав. Казакевічам (прадстаўніком галоўнага кіраўніцтва рабоча - сялянскай міліцыі БССР), па ўказаньні якога выстройвае сваю калёну і атрымлівае ўказаньні аб далейшым парадку яе руху. Кіраўнікі калён адказваюць за захоўваньне парадку сваёй калёны і для адрозьніваньня павінны мець на левай руцэ чырвоную павязку з адзнакай нумару калён.

Міліцыі спыніць хаджэньне і язду па вуліцах, якія знаходзяцца да пляцаў Волі і Парыскай Камуны, з 9 гадз. раніцы 1 мая, забясьпечыўшы вольны шлях па маршрутах сьледваньня калён.

На трыбуну пляцу Волі праходзяць: члены бюро ЦК і Менгаркому КП(б)Б, прэзыдыуму ЦКК і гарКК КП(б)Б, бюро ЦК і гаркому ЛКСМБ, прэзыдыум ЦВК і СНК БССР, члены прэзыдыуму, гарсавету, прэзыдыуму ЦСПСБ і гарпрафсавету.

Плян пабудовы і руху калён дэманстрацыі

ПЕРШЫ МАРШРУТ. Уваход калён на пляц Волі з вуліцы Энгельса.

ПЕРШАЯ КАЛЁНА: заводы «Бальшавік», «Камунар», імя Варашылава, фабрыкі «Кастрычнік», «Камунарка», шчотачная. Выстройваюцца а 11 гадз. па вуліцы К. Маркса, каля дому камасьветы.

ДРУГІ МАРШРУТ. Уваход калён па пляц Волі са Школьнай вуліцы.

ПЕРШАЯ КАЛЁНА. Чыгуначнікі і заводы «Полымя рэвалюцыі», «Ударнік». Зьбіраюцца каля клюбу 13-цігодзьдзя; а 11 гадз. пачынаюць рух па Нова-Маскоўскай і Нямігскай вул., становячыся галавой калёны каля гарпрафсавету, адкуль па прыбыцьці на пляц Волі першай калёны злучаюцца з ёю і праходзяць разам каля трыбуны на Ленінскую, па Савецкай вуліцы да вул. Валадарскага дзе і разыходзяцца.

ДРУГАЯ КАЛЁНА. Швэйнікі, тэкстыльшчыкі, фабрыка імя Крупскай, 8-е сакавіка, 1 мая, «Чырвоны тэкстыльшчык», ФЗВ, КІМ. Зьбіраюцца а 11 гадз. па вуліцы К. Маркса каля дзяржтэатру і выходзяць на вуліцу Энгельса, сьледуючы за першай калёнай.

Шклозавод, хэмфармзавод, «Чырвоны хэмік». Зьбіраюцца каля шклозаводу і а 11 гадз. пачынаюць рух на Чырвонамысьленскім завулку, Савецкай, Н. Маскоўскай і Нямігскай вул. услед за першай калёнай (чыгуначнікі).

ТРЭЦЯЯ КАЛЁНА. Паліграфічная і папяровая прамысловасьць. Друкарня імя Сталіна і іншыя друкарні, пшалерная фабрыка. Зьбіраюцца ў друкарні імя Сталіна а 11 гадз., пачынаюць рух па Кастрычніцкай вуліцы, пав. Луначарскага, Чырвонаармейскай і сьледуюць за другой калёнай (швэйнікамі).

Гарбарнікі. Абутковая фабрыка «Усход», шчаціённая, лямпавая, уціль, абутковая майстэрня гарсавету. Зьбіраюцца па Камсамольскай вул. каля клюбу гарбароў і выходзяць на Нямігскую вуліцу за другой калёнай (шклозаводам).

ЧАЦЬВЕРТАЯ КАЛЁНА. Дрэваапрацоўшчыкі і будаўнікі. Зьбіраюцца па Савецкай вуліцы каля клюбу «Дрэваапрацоўшчык» і а 11 гадз. пачынаюць рух па Савецкай і сьледуюць за трэцяй калёнай (паліграф і папяровая прамысловасьць).

Харчавікі, Хлебазавод, «Беларусь», «Пралетары», «Чырвоная зорка», сьпіртазавод, малочны завод, мясакамбінат і калектыў харчавікоў. Зьбіраюцца па Камсамольскай вуліцы ў клюбе харчавікоў і выходзяць на Нямігскую вуліцу за трэцяй калёнай (гарбарнікамі).

ПЯТАЯ КАЛЁНА. Камунальнікі, электрастанцыя, вадаканал, В. А., торфзаводы, гарадзкія прадпрыемствы і хатнія работніцы. Зьбіраюцца па Садовай вуліцы супроць клюбу Эльводу і сьледуюць за чацьвертай калёнай (дрэваапрацоўшчыкі).

Працаўнікі асьветы і мастацтва. Зьбіраюцца па вуліцы Валадарскага каля дому Культуры і а 11 гадз. пачынаюць рух па вуліцы Валадарскага, Інтэрнацыянальнай, Рэспубліканскай, выходзяць на Нямігскую і сьледуюць за чацьвертай калёнай (харчавікамі).

ШОСТАЯ КАЛЁНА. Транспартнікі і сувязь: Саюзтранс, транспартгрэст, трампарк, УМТ, Белкіраўніцтва сувязі і інш. Зьбіраюцца па Ленінскай вуліцы ў клюбе сувязі і выходзяць на вуліцу К. Маркса па рогу Энгельса, прапускаюць пярэдніх калёны і сьледуюць за пятай калёнай (камунальнікамі).

Студэнты: Камвуз, курсы партактыву, БДУ, Інстытуты, тэхнікумы, Рабфакі і розныя школы і курсы. Зьбіраюцца каля Універсытэцкага гарадка і каля 11 гадз. пачынаюць рух па Савецкай вуліцы, па вул. Валадарскага, сьледуючы за 5-й калёнай (працасьветы).

СЁМАЯ КАЛЁНА. (Саўгасы, МТС, пры гарадныя гаспадаркі, калгасы, батрацка - бядняцкія і серадняцкія масы прыгараднага сельсавету. Зьбіраюцца па Чырвонаармейскай вуліцы каля дому ЦК КП(б)Б (былы дом Калгасьніка) і пасьля праходу папярэдніх калён пачынаюць рух па вуліцы К. Маркса ўсьлед за пятай калёнай транспартнікамі).

Мэдсанпрацы. Зьбіраюцца па вуліцы Сьвярдлоўскай каля пэрвовай клінікі і пачынаюць рух па Савецкай і Валадарскага вуліцах за шостай калёнай (студэнтамі).

ВОСЬМАЯ КАЛЁНА. Работнікі каапэрацыі, савецкага гандлю, фінбанкаўскіх і дзяржаўных устаноў. Зьбіраюцца па Камуністычнай каля клюбу саўгандальслужачых і выходзяць на вуліцу Энгельса за 7-й калёнай (саўгасамі і калгасамі).

Арцелі Белсамрамсаюзу, БСКА і саматужнікі. Зьбіраюцца каля клюбу саматужнікаў і пачынаюць рух па Ракаўскай і Нямігскай вуліцах услед за сёмай калёнай (мэдсанпрацы).

1 мая з 4 да 7 гадз. ва ўсіх кінатэатрах адбудуцца дармовыя кіносэансы для членаў саюзу.

2 мая з 12 гадз. да 1 гадз. 30 хв. ва ўсіх кіно- тэатрах адбудуцца дармовыя кіно - сэансы для чырвонаармейцаў; з 2 да 4 гадз. кіно - сэансы для піянэраў і школьнікаў.

30 красавіка, 1 і 2 мая ўвечары дэманструюцца кіно - карціны ў наступных пунктах гораду:

1. пляцы Волі, 2. Барысаўскім тракце, 3. Койданаўскім тракце, 4. Пасёлку «Камінтэрн», 5. на бульвары па Савецкай вуліцы.

2 мая на пляцы Волі з 10 гадз. 30 хв. адбудзецца піянэрская дэманстрацыя сумесна са школьнікамі.

1 і 2 мая на ўсіх бульварах граюць аркестры.

КАМІСІЯ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ СЬВЯТКАВАНЬНЯ 1-га мая.

НАПЯРЭДАДНІ 1-га МАЯ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

160 рэвізій і 40 арыштаў за адну ноч

ВІЛЬНЯ, 18. Як кожны год, так і сёлета набліжэньне дня міжнароднай пралетарскай салідарнасьці — 1 мая — адзначаецца новай хваляй тэрору.

Уздым нацыянальна-вызваленчай барацьбы, далейшае паглыбленьне рэвалюцыйнага руху, якое адбываецца на грунце абвостранага да апошніх граніц эканамічнага крызісу — гаворыць за тое, што надыходзячая маёўка будзе адзначана магутнымі выступленьнямі рабочых і сялян Заходняй Беларусі.

Дэфэнзыва ўжо загадзя «рыхтуецца» да страшнага і ненавіснага дня, якім зьяўляецца для яе 1 май. Хваля прадпершамайскага тэрору ўзьнялася параўнальна раней, чым у мінулым годзе.

Фашысцкая прэса паведамляе, што яўная і тайная паліцыя бязупынна праводзіць аблавы і арышты ў рабочых кварталах Вільні. Так, за адну толькі ноч з 11 на 12 было праведзена больш як 160 вобыскаў. Звыш 40 чалавек арыштаваны і пасаджаны ў турму.

Дэфэнзыва, як піша «Кур'ер Віленскі», цьвёрда пераконана ў тым, што «актыўныя члены камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ў сувязі з надыходзячым 1 мая вядуць энэргічную падрыхтоўку да выступленьняў».

Прэса расьпісваецца аб нібы выкрытых складах нелегальнай літаратуры, аб знойдзеных чырвоных сьцягах і транспарантах з антыдзяржаўнымі і першамайскімі лёзунгамі». Прозьвішчы арыштаваных трымаюцца ў таямніцы.

Адначасова з арыштамі ў Вільні разгортваецца паласа арыштаў на правінцыі. Адбываюцца аблавы ў цягніках. У цягніку Вільня - Варшава арыштаваны пасажыр, якога дэфэнзыва лічыць «спэцыяльным інструктарам па першамайскіх справах». На тэрыторыі віленскага ваяводзтва арыштавана звыш 20 асоб. З іншых мясцовасьцяй Заходняй Беларусі надыходзяць таксама весткі аб масавых арыштах. Прэса агульнай лічбы арыштаваных не падае.

Але наперакор абвостранаму тэрору рабоча-сялянскія масы Заходняй Беларусі, пад кіраўніцтвам кампартыі, рыхтуюцца адзначыць 1 мая баявымі масавымі дэманстрацыямі.

Масавыя арышты ў Польшчы

ВАРШАВА. 16. Набліжэньне 1-га мая азнаменавалася ва ўсёй Польшчы масавымі арыштамі рэвалюцыйных рабочых. У гэтэтах друкуецца правакацыйнае паліцэйскае паведамленьне аб арыштах ў цягніку шэйкіх «патаемных камуністычных камісараў».

Сьледчыя і судовыя ўлады падрыхтавалі сэрыю працэсаў супроць рэвалюцыйных рабочых. У Петракове, Роўна, Сувалках, Баранавічах і іншых гарадох вынесены катаржныя прыгаворы групам рабочых. Ва Львове працягваецца працэс 15 рабочых, якія абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да кампартыі, у забойстве правакатара і дзяржаўнай здрадзе. Падсудныя зрабілі заяву на судзе аб зьбойствах іх паліцыяй і сьледчымі ўладамі.

З набліжэньнем 1-га мая вэнгерская паліцыя ўзмацняе тэрор

ВЕНА. Як паведамляюць з Будапешту, вэнгерская кампартыя апублікавала сярод працоўных Вэнгрыі першамайскую адозву, у якой выкрывае падрыхтоўку вэнгерскай буржуазіі да вайны супроць СССР і антысавецкі характар дунайскай федэрацыі. У адозьве пералічваецца рад прадпрыемстваў, на якіх э ліквамаваай шкарасьцю выраблюцца ваенныя матар'ялы.

Адозва заклікае працоўных перапрадоўць вырабу і транспарту ваенных матар'ялаў, адмаўляць на падрыхтоўку буржуазіі да вайны масавымі забастоўкамі. Вэнгерская паліцыя адказала на ўзмацненьне актыўнасьці вэнгерскай кампартыі масавым тэрорам. Раскрыта падпольная друкарня кампартыі, пры чым было канфіскавана шмат тысяч экземпляраў першамайскіх адозваў. На ўсёй краіне арыштаваны масавыя арышты сярод рабочых.

Па Савецкім Саюзе

Сяўба на поўдні

На 10 красавіка засеяна 2.089 тыс. га яравых культур, з іх калгасамі — 1.698 тыс., аднаасобнікамі — 197 тыс. га. Другая пяцідзёнка красавіка дала некаторы рост тэмпаў сяўбы — 721 тыс. га супроць 522 тыс. га ў папярэднюю пяцідзёнку. Аднак, гэтыя тэмпы не забясьпечваюць рашучага пералому ў разгортваньні веснавой сяўбы.

Далёка невыстарчальна разгортваецца сяўба ў аднаасобных гаспадарках. Так, у Крыме калгасьнікі засеялі на адну гаспадарку ў сярэднім 2,5 га, аднаасобнікі толькі 0,7 га. На Паўночным Каўказе калгасьнікі засеялі 0,45 га на гаспадарку, аднаасобнікі — 0,01 га. Рад калгасаў няправільна выкарыстоўваюць цягавую сілу. Неабходна, каб раённыя арганізацыі неадкладна выправілі гэтыя недахопы і дабіліся рэзкага пералому ў ходзе сяўбы.

Экспэдыцыя ў Таджыкістан і на Памір

У гутарцы з супрацоўнікам ТАСС начальнік Таджыкскай экспэдыцыі Усесаюзнай акадэміі навук тав. Гарбуноў паведаміў наступныя дэталі аб экспэдыцыі ў Таджыкістан і на Памір.

У Таджыкістане і на Паміры ёсьць вялізныя колькасьці золата, срэбра, сьвінца, рэдкія і колькавыя. Гэта краіна адна з найбагацейшых гідра - энэргетычнымі рэсурсамі і на багацьцяй энэргіі паўвіна быць пастаўлена на першае месца. У сувязі з адкрыцьцямі, зробленымі папярэднімі экспэдыцыямі, таджыкскі ўрад зьвярнуўся ў Наркам прамсправы СССР, у акадэмію навук Саюзу, у кампэнсацыйную акадэмію с.-г. акадэмію з прапановай арганізаваць вялікую камплексную экспэдыцыю, асноўнай задачай якой зьяўляецца ўсебаковае вывучэньне прадукцыйных сіл Таджыкістана і, у прыватнасьці, Паміра з тым, каб на аснове ўліку рэзультатаў работ экспэдыцыі мець аправедны матар'ял па распрацоўцы багацьцяў рэспублікі ў другой пяцігодцы.

Першыя атрады экспэдыцыі, работа якіх зьвязана з пачаткам веснавога пэрыяду, ужо выехалі. Асноўнае ядро экспэдыцыі выедзе ў цэнтральны Таджыкістан у канцы красавіка, а на Памір — у канцы мая. Непасрэдны ўдзел у экспэдыцыі кіраўніка адной з нялікіх груп экспэдыцыі па вывучэньні ледасьпаўзання найвышэйшага горнага вузла Гарме прымае старшыня «ОПТЭ» тав. Крыленка. У экспэдыцыі «прымаюць таксама ўдзел акадэмік Фэрсман і акадэмік Вавілаў.

Зямлятрасеньне на востраве „Сьвіной“

БАКУ, 17. Паводле праверэных даных, вочнены выбух вулкану на востраве «Сьвіной» адбываўся на працягу 10-15 мінут.

У выніку ўсе паўднёва-заходняя частка востраву абгарэла, а паўночна-заходняя заліта пластом выбухнутай гразі. У часе пажару абгарэў малы, агарэлі склад апалу і маятнага абсталяваньня, а таксама дом, дзе знаходзілася сірэна і прыстань. Уцалеў адзін жылы дом.

У часе выбуху на востраве знаходзілася 5 служачых, 10 членаў сем'яў, 6 рыбакоў і 2 часова прыбыўшыя да дагляднчыка маяка. Усяго 23 чал.

Тыя, што кінуліся да людзей, былі насьцігнуты вогненнай лавай, з прычыны чаго атрымалі апёкі. 6 рыбакоў, 2 служачыя маяка, 7 членаў іх сем'яў загінулі ў агні. Дзьве жанчыны, і трое дзяцей, якія былі выратаваны і апечатаны, былі прынятыя на борт параходу «Якаў Зевін», які стаяў у паўтара мілях ад востраву, і дастаўлены ў Баку. З дастаўленых у больніцу памерлі 1 жанчына і 3 дзяцей.

На маяку па абавязку заставаліся ўвесь час, пя гледзячы на сур'ёзныя апёкі, наглядчык і 2 служачых. Усе яны дастаўлены судном у Баку.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Выкананьне прамфінпляну лёгкай прамысловасьці БССР

Паводле вестак Наркамату лёгкай прамысловасьці БССР, прадпрыемствы лёгкай прамысловасьці за 10 дзён красавіка выканалі месячную праграму на 30,4 проц. Выпушчана прадукцыі іна 8.471 тыс. руб.

Хэмічная прамысловасьць выканала плян на 33,8 проц., у тым ліку «Чырвоны хімік»—на 29,3 проц., крэйдавы завод—38,6 проц.

Гарбарная прамысловасьць выканала плян на 31,1 проц., у тым ліку гарбарня «Бальшавік»—38,3 проц., віцебская гарбарня—35,9 проц., гомельская—33,5 проц., магілёўская—26,7 проц., рымарная фабрыка—22,9 проц.

Абутковая прамысловасьць выканала месячны плян на 28,2 проц., у тым ліку менская абутковая—на 32,8 проц., віцебская—на 24,3 проц., ФЗВ абутнікаў—на 19,8 проц.

Шкляная прамысловасьць выканала плян на 30,4 %; у тым ліку гута «Камінтэрн»—на 34,4 проц., гута «Кастрычнік»—33,5 проц., «Ільліч»—23 проц., «Пралетары»—25,2 проц.

Швэйная прамысловасьць выканала сваю месячную вытворчую праграму на 10 дзён красавіка на 30,7 проц.; у тым ліку фабрыка «Кастрычнік»—на 33,6 проц; «Сьцяг індустрыялізацыі»—31 проц., «Прафінтэрн»—32,2 проц., ф-ка «Камінтэрн»—43,1 проц., імя Валадарскага—31,6 проц., імя Дзяржынскага—28,1 проц., імя Крупскай — 28,79 проц. «8-е сакавіка» — 30,7 проц., ФЗВ «КІМ»—29,9 проц., імя «Х-цігодзьдзя»—27,4 проц.

Кушнерная прамысловасьць выканала вытворчую праграму на 23,8 проц.

Запалкавая прамысловасьць выканала плян на 31,7 проц.; у тым ліку фабрыка імя 10 кастрычніка—28 проц., фабрыка «Перамога»—35 проц.

Фанэрная прамысловасьць выканала плян на 34,5 проц.; у тым ліку ф-ка «Днепро»—на 32,9 проц., «Бярэзіна»—на 38,5 проц.

Паліграфічная прамысловасьць выканала плян на 29,6 проц.; у тым ліку друкарня імя Сталіна—на 31,3 проц., «Палесьдрук»—27 проц., барысаўская друкарня—29,1 проц. і шпалерная фабрыка (Менск)—31,9 проц.

Пабудова вопытнай каксавальнай печы ў БССР

Улічваючы вялізарнае народна-гаспадарчае значэньне каксаваньня торфу для патрэб мэталюргічнай прамысловасьці, транспарту і сельскай гаспадаркі, Эканамічны Савет БССР адпусьціў 70 тыс. руб. на пабудову ў БССР вопытнай каксавальнай печы.

Пабудова печы ўключана ў лік першачарговых. Гэта работа ўскладзена на Белбудпаб'яднаньне, якому прапанавана скончыць пабудову не пазьней 1 кастрычніка г. г. Упаўнаважанаму наркамату цяжкай прамысловасьці даручана заказаць на заводах СССР абсталяваньне для печы. Інстытут прамысловасьці павінен не пазьней 1 студзеня 1933 г. зрабіць выпрабаваньне печы. Вопытна-каксавальная печ будзе пабудавана ў раёне Міханавіцкай тарфяной станцыі.

(Белта).

Сельгасмашыны

Завод «Чырвоны изталіст» за 16 красавіка выпусьціў 14 жнівхадрабілак, або 87,5 проц., 15 корнярэзак—75 проц., 25 бульбамыек—83,3 проц. і 55 боран «Зіг-Заг»—105,5 проц. заданьня.

На першай БелДРЭС

15 красавіка 1 Белдрэс выпрацавала 166.500 клв.-гадзін. Максымум дасягнуў 8.500 клв., мінімум—5.800 клв. і сярэдняя 6.900 клв. 16 красавіка выпрацавана 167 тыс. клв. гадзін. Максымум дасягнуў 8.500 клв., мінімум—6.250 клв. і сярэдняя—6.958 клв.

Будматар'ялы

Лесазавод «Спартак» за 15 красавіка расьпілаваў 77 кбм. сырцу, або 96 проц. пляну. 16 красавіка расьпілавана 107,5 кбм. сырцу, або 133 проц. пляну.

* * *

16 красавіка **камбінат «Камінтэрн»** расьпілаваў 192,5 кбм. сырцу, або 79,1 проц. Фанэры выпушчана 51,5 кбм., або 104,3 проц.

Абутак

Гомельская абутковая фабрыка «Праца» за 14 красавіка выпусьціла 725 пар ботаў, або 71,4 проц. пляну, 1.116 пар мужчынскіх баціпак—108,3 проц. і г. д. Усяго выпушчана 3.020 пар абутку, або 95,9 проц. пляну.

Скура

Віцебская гарбарня за 3 пяцідзёнку красавіка выпусьціла прадукцыі на суму 121.693 руб., што складае 130,8 проц.; у тым ліку чырвона-дубны цэх даў прадукцыі на суму 38.420 руб., або 127,3 проц. пляну.

* * *

Аўчынна-футровы завод «Пралетарскі шлях» за 3 пяцідзёнку красавіка выпусьціў прадукцыі на суму 21.329 руб., што дае 104,1 проц. пляну.

Папера

Добруская папяровая фабрыка «Герой працы» за 16 красавіка выпусьціла 60 тон паперы, або 74,4 проц. Салома-цэлюлёзы выпушчана 9 тон, або 75 проц. пляну.

* * *

Папяровая фабрыка «Спартак» за 14 і 15 красавіка выпусьціла 12,45 тоны паперы, або 60,3 проц. пляну.

* * *

Папяровая фабрыка «Чырвоная зорка» за 16 красавіка выпусьціла 12,6 тоны паперы, або 72,7 проц. пляну. Працавала толькі адна машына.

Прасоўваньне друку ў масы—задача партыйных і прафсаюзных арганізацый

«Друк зьяўляецца самай моцнай, самай вострай зброяй партыі». (Сталін). Праз друк партыя мабілізуе і арганізуе найшырэйшыя масы пралетарыяту і працоўнага сялянства на актыўную барацьбу з клясавым ворагам, на пабудову сацыялізму.

Вось чаму сваячасовая і бесьперабойная дастаўка пэрыядычнага друку падпісчыкам набывае вялізарнае значэньне. Органы сувязі павінны перабудаваць сваю работу так, каб забясьпечыць сваячасовы прыём падпіскі і апрацоўкі заказаў.

Паміж Саюздрукам і выдавецтвамі заключан дагавор, які прадугледжвае кантрольныя тэрміны здачы друку паштовым органам. Аднак, ні выдавецтвы, ні органы сувязі кантрольных тэрмінаў ня прытрымліваюцца.

Безадказнасьць паасобных выдавецтваў, а таксама органаў сувязі пазбаўляе падпісчыка магчымасьці чытаць газэту ў дзень яе выхаду. У Гомель «Зьвязда» прыбывае раніцой і пошта чакае маскоўскіх газэт, якія прыбываюць вечарам. І толькі на другі дзень менскія і цэнтральныя газэты ідуць у разноску. У Гэчыцу і Добрун «Зьвязда» прыбывае на другі дзень пасьля выхаду, а падпісчыкі атрымліваюць яе адразу за цэлы тыдзень. Такое-ж становішча ў Бабруйскім, Клічаўскім і іншых раёнах.

Адсутнасьць адказнасьці з боку менскага аддзелу дастаўкі за даручаную справу прывяла да таго, што ў сакавіку месяцы падпісчыкі не атрымалі: «Праўды»—19.389 экз., «Известий» — 14.005 экз., «Зьвязды»—6.272 экз., «Савецкай Беларусі»—12.188 экз., «Рабочего»—52.624 экз. і г. д.

Пяцідзеньнік агляду работы бюро скаргаў, які праводзіцца ЦКК і НКРСІ, не зрабіў належнага зруху ў паляпшэньні працы менскага апарату сувязі. Партыйная і прафсаюзная арганізацыі сувязі не мабілізавалі супрацоўнікаў апарату на барацьбу з бюракратызмам і чыноўніцкімі адносінамі да шматлікіх скаргаў, якія паступаюць ад падпісчыкаў.

У першым квартале 1932 г. па дрэнную дастаўку пэрыядычнага друку паступіла 9.195 скаргаў. А як гэтыя скаргі разгледжаны, кіраўнікі аддзелу дастаўкі ня ведаюць. Яны нават ня ведаюць, хто павінен адказваць за рэалізацыю скаргаў.

Пяцідзеньнік агляду работы бюро скаргаў павінен ператварыцца ў масавую праверку хутчэйшага прасоўваньня скаргаў. Работа менскага аддзелу дастаўкі зьяўляецца паказальнікам таго, як ня трэба працаваць.

Партыйныя, прафсаюзныя арганізацыі павінны мабілізаваць працоўных на барацьбу з нядбайнымі адносінамі ў справе прасоўваньня пэрыядычнага друку ў масы.

А.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

СЕНЬНЯ, 20 красавіка, роўна ў 7 гадз. веч., у актавай залі Бел. Дзярж. Універсытэту (галоўны корпус, Універсытэцкі Гарадок) адбудзецца

урачыстае пасяджэньне, прысьвечанае 50-годзьдзю са дня сьмерці Ч. Дарвіна.

ПАРАДАК ДНЯ:
1) Уступнае слова праф. Федзюшына.
2) Марксызм-ленінізм і дарвінізм—дакл. дац. Дзербянцоў.
3) Натуральны адбор і эвалюцыя—дакл. дац. Зубковіч.
4) Дарвін, як эвалюцыяніст—дакл. дац. Гусева.

Запрашаюцца ўсе навуковых працаўнікі ВНУ і НДІ, настаўніцтва БДУ, студэнцтва ВПІ мэд. інт.

Арг. камісія БДУ.

21 красавіка, у 7 гадз. веч., у клюбе Нарсувязі (Ленінская, 34)

дзяржарбітражам з удзелам грамадзкасьці

БУДУЦЬ РАЗГЛЕДЖАНЫ СПРЭЧКІ

паміж выдавецтвам „Зьвязда“ і Саюздрукам Бел. кіраўніцтва сувязі

аб недахопах па дастаўцы газэт і часопісяй.

Запрашаюцца рэдакцыйна-выдавецкія работнікі, рабкоры і чытачы газэт.

Уваход вольны

Дзярж. арбітр. пры СНК БССР.

20 красавіка, у 7 гадзін веч., у памяш. клюбу БКС (Савецкая, 4а, ва двары)

АДБУДЗЕЦЦА

АГУЛЬНЫ СХОД КААПАКТЫВУ г. Мозыру.

З ПАРАДКАМ ДНЯ:
1) Даклад члена праўленьня аб новым дыфпаі;
2) Даклад аб падрыхтоўцы да забясьпячэньня гарадзкіх насельніцтва у бягучым годзе:
3) Розныя: а) аб дальнейшым парадку забясьпячэньня дровамі пайшчыкаў МЦРК,
б) выпіскі папярэдняй падпіскі.
Яўка усяго каапактыву абавязкова.

Праўленьне МЦРК.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ — Амэрыканскі фільм МАЎЧАЦЬ (бязбоніца) у 2-х сэриях, 10 частках

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ — Замежны фільм ЖОНКА СТАТС-САКРАТАРА

ПРАЛЕТАРЫ — Новы фільм вытворч. Дзяржкінапрамгрупы СКОРЫ № 2

„СПАРТАК“ Пач. 6-30, 8., 9-30 і 10-45 КАСА—З. 5 ГАДЗ. — Ігар Ільпінскі ў карціне ЗАКРОЙШЧЫК З ТАРЖКА камедыя ў 6 частках.

Гомельскім аграпэдінстытутам адкрыт ПРЫЁМ ЗАЯЎ на асеньні НАБОР 1932 г. на фізыка-матэматычнае, хэміка-біялягічнае і вячэрняе аддзяленьне 1-га курсу. Адрас: г. Гомель, Пралетарская, 2, агра-пэдінстытуту.

Дырэкцыя.

Інстытуту гісторыі партыі ПАТРЭБНЫ 2 машыністкі на сталую працу і на вячэрнюю зьмену.

Менск. друкарня газ. «Зьвязда». Галоўлітбел № 337.